

# ФАРМАТ ШМАТВЕКТАРНАГА ДЫЯЛОГУ

**У суботу Прэзідэнт праводзіў перагаворы з дэлегацыяй ЗША і даваў інтэрв'ю амерыканскаму СМІ, а ўчора сустракаўся з міністрам замежных спраў Ірана**

(Стар. 2–3)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ
ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
16 снежня 2025 г. АЎТОРАК № 242 (30630)

# КРАІНА ЯК ВЯЛІКАЯ СЯМ'Я

**У Беларусі стартавала рэспубліканская акцыя «Нашы дзеці»**






СТАР. 5

Фота БелТА.




ГОРАД ПОМНІЦЬ ГЕРОЯЎ

13

ВІТРАЖЫ МАЙСТЭРСТВА

## ПРАФЕСІЮ — У ЗАЛАТЫЯ РУКІ

**Высокакваліфікаваных работнікаў па цэлым россыпе спецыяльнасцяў рыхтуюць у Віцебскім тэхналагічным каледжы**



Установа адукацыі адзінаццаты год з'яўляецца філіялам БДТУ, што ў Мінску. Тры аддзяленні каледжа — «Інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі», «Тэхнічная эксплуатацыя аўтамабіляў», «Лясная гаспадарка і тэхналогія дрэваапрацоўчай вытворчасці» — інтэграваны ў названую ВНУ. Іх выпускнікі з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй змогуць атрымліваць ва ўніверсітэце вышэйшую адукацыю па скарочанай праграме па профільных кірунках.

СТАР. 10

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X
25242
9 771990 763008

Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2026 года
Мы абяцаем нясумны час з любімай газетай.
Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2026 года, у падарунак календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.



# ЗША ЗНЯЛІ САНКЦЫІ З БЕЛАРУСКАГА КАЛІЮ

## Гэта адзін з вынікаў двухдзённых перагавораў Аляксандра Лукашэнкі са спецпасланнікам ЗША ў Беларусі Джонам Коўлам

Як і было напярэдадні анансавана, беларуска-амерыканскія перагаворы, якія пачаліся 12 снежня, працягнуліся 13 снежня. Выхадным днём у Палацы Незалежнасці было не па-зімняму горача і насычана.

Пасля перагавораў за зачыненымі дзвярыма Джон Коўл адказаў на пытанні журналістаў. «У адпаведнасці з указаннямі Прэзідэнта Трампа ЗША здымаюць санкцыі з калію, — праінфармаваў спецпасланнік ЗША ў Беларусі. — Думаю, гэта вельмі добры ход з боку ЗША для Беларусі. Мы іх здымаем цяпер».

Па словах Джона Коўла, адносіны на тэму санкцый паміж Беларуссю і Злучанымі Штатамі Амерыкі будуць працягвацца і далей. «Па меры нармалізацыі адносін паміж дзвюма краінамі ўсё больш санкцый будзе здымацца», — удакладніў ён, выказаўшы надзею на тое, што ў будучым бакі прыйдуць да сітуацыі, калі санкцый увогуле не будзе.

Спецпасланнік ЗША ў Беларусі падкрэсліў, што перагаворы з Аляксандрам Лукашэнкам былі вельмі прадуктыўныя. «Мы гаварылі аб вайне паміж Украінай і Расіяй, аб Венесуэле, — канкрэтызаваў ён. — Прэзідэнт Лукашэнка згадаў шмат людзей і шмат рэчаў. У нас была вельмі добрая размова. Мы гаварылі аб будучыні. Аб тым, як ісці па шляху збліжэння ЗША і Беларусі, каб нармалізаваць адносіны. Гэта наша мэта».

Адказваючы на пытанне, што трэба рабіць для далейшай нармалізацыі беларуска-амерыканскіх адносін, Джон Коўл адзначыў, што ўсё патрэбнае ў гэтым кірунку ўжо робіцца. «Мы здымаем санкцыі, вызваляем зняволеных. Мы пастаянна размаўляем адзін з адным, — удакладніў ён. — Па меры таго, як мы становімся бліжэй і бліжэй, больш гаворым, абменьваемся ідэямі, ідзе працэс пераходу ад першых дзіцячых крокаў да ўжо больш упэўненых крокаў».

Па словах спецпасланніка ЗША ў Беларусі, размова з Аляксандрам Лукашэнкам вялася па розных пытаннях. «Ён (беларускі лідар. — **«Зв.»**) дапамагае, раіць нам па пытанні таго, што



Фота БелТА.

## АД БУДУЧЫНІ БЕЛАРУСКА-АМЕРЫКАНСКІХ АДНОСІН ДА СІТУАЦЫІ ВАКОЛ ВЕНЕСУЭЛЫ

### Прэзідэнт Беларусі даў інтэрв'ю буйному амерыканскаму СМІ

Пытанні Аляксандру Лукашэнку задавала вядучая праграмы «Хроніка з Грэтай Ван Састэрэн» тэлеканала «Ньюсмакс ТВ» тэлекампаніі «Ньюсмакс» Грэта Канвей Ван Састэрэн. Дарэчы, яна з'яўляецца жонкай спецпасланніка ЗША ў Беларусі Джона Коўла, з якім у пятніцу і суботу кіраўнік дзяржавы вёў перагаворы.



Сярод тэм, якія закраналіся падчас інтэрв'ю, — будучыня беларуска-амерыканскіх адносін, перспектывы ўрэгулявання расійска-ўкраінскага канфлікту і роля ў гэтым працэсе Дональда Трампа. Яшчэ адной тэмай размовы стала сітуацыя вакол Венесуэлы, напружаныя адносіны гэтай краіны з ЗША на фоне абвінавачванняў апошняй у наркатрафіку. Акрамя таго, журналіст пацікавілася ў Аляксандра Лукашэнкі яго асабістымі адносінамі з прэзідэнтамі Расіі, Кітая, уражаннямі ад зносін з іншымі сусветнымі лідарамі.

У самым пачатку інтэрв'ю амерыканскай тэлекампаніі Аляксандр Лукашэнка жартам папрасіў інтэрв'юера Грэту Канвей Ван Састэрэн не задаваць яму «брыдкіх пытанняў» у дачыненні да трох чалавек.

«Я перакананы прыхільнік Трампа, — заўважыў беларускі лідар. — У мяне ёсць сваяк, блізкі сваяк — Прэзідэнт Расіі (Аляксандр Лукашэнка часта называе Уладзіміра Пуціна «старэйшым братам». — **«Зв.»**). І ёсць вельмі добры мой сябар (з даўніх часоў яшчэ, да часоў, калі ён кіраваў дзяржавай) — гэта Сі Цзіньпін. Таму ніякіх брыдкіх пытанняў у адносінах да гэтых трох асоб не задавайце. Жарт».

Тэлекампанія «Ньюсмакс», заснаваная ў 1998 годзе, пазіцыянуе сябе як незалежная платформа навін. Аднак у журналісцкай супольнасці яе часта адносяць да медыя, блізкае да кансерватыўных і рэспубліканскіх колаў ЗША. Па ўласных ацэнках кампаніі, штомесячная аўдыторыя тэлеканала і анлайн-платформы перавышае 20 мільёнаў чалавек.

Размова Прэзідэнта з журналістам амерыканскага медыя будзе апублікавана на старонках газеты «Звязда» і на пляцоўцы сеткавага выдання zviazda.by ў найбліжэйшы час.

## «ЯК ВЕЛЬМІ БУЙНЫЯ ГЕАПАЛІТЫЧНЫЯ ПЫТАННІ, ТАК І КАНКРЭТНЫЯ ДВУХБАКОВЫЯ ПРАКТЫЧНЫЯ»

### Акцэнты шматгадзінных перагавораў і што сказана ў пасланні сям'і Трамп, адрасаванаму Аляксандру Лукашэнку



Прэзідэнту Беларусі перададзена асабістае пасланне ад прэзідэнцкай пары ЗША — Дональда і Меланіі Трамп. Аб гэтым у эфіры тэлеканала «Першы інфармацыйны» расказала прэс-сакратар беларускага лідара Наталля Эйсмант.

Пасланне перададзена праз спецыяльнага пасланніка ЗША ў Беларусі Джона Коўла, з якім Аляксандр Лукашэнка 12 і 13 снежня праводзіў перагаворы ў Мінску. Па словах Наталлі Эйсмант, Дональд і Меланія Трамп, напрыклад, дзякуюць беларускаму боку і асабіста Прэзідэнту за гасціннасць, якая пастаянна аказваецца амерыканскай дэлегацыі.

«Адзначаюць нашу беларускую гасціннасць, гавораць аб вельмі сардэчным прыёме, — канкрэтызавала прэс-сакратар беларускага лідара. — Дзякуюць за прэзенты, якія раней наш Прэзідэнт перадаваў Дональду і Меланіі. І віншуюць з надыходзячымі Калядамі, жадаюць шчаслівых Калядаў. Таксама Дональд Трамп адзначае, што з нецярпеннем чакае вяртання Джона Коўла дадому, каб даведацца падрабязнасці праведзеных перагавораў».

Перагаворы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі са спецпасланнікам Прэзідэнта ЗША па Беларусі Джонам Коўлам доўжыліся па некалькі гадзін 12 і 13 снежня ў Мінску ў Палацы Незалежнасці.

Адказваючы на пытанне аб падрабязнасцях перагавораў, Наталля Эйсмант адзначыла: «На тое перагаворы і закрытыя, каб нейкія інсайды па гарачых слядах усё ж не агучваць. Думаю, вы не сумняваецеся і ніхто не сумняваецца, што ўсё, што неабходна, па меры магчымасці, мы, вядома, аб гэтых перагаворах дадаткова раскажам. Абмяркоўваліся, зразумела, як вельмі буйныя геапалітычныя пытанні, так і канкрэтныя двухбаковыя практычныя».

### Дарэчы

Як заявіла ТАСС прэс-сакратар Прэзідэнта Беларусі Наталля Эйсмант, Беларусь гатова экспартаваць калійныя ўгнаенні праз любыя парты, зыходзячы з мэтазгоднасці.

«Тут галоўнае — эканоміка, лагістыка, эканамічная мэтазгоднасць. Куды будзе выгадна, туды і павязём», — удакладніла яна.

## «БЕЛАРУСЬ НАРМАЛІЗАЦЫІ

### Падрабязнасці ад пастаяннага «Першы

**Гаворачы аб атмасферы нядаўніх перагавораў паміж Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам і спецпасланнікам ЗША ў Беларусі Джонам Коўлам, Валянцін Рыбакоў, які прысутнічаў на ўсіх перагаворах і выступаў у ролі перакладчыка, падкрэсліў, што гэта была вельмі сяброўская размова, бо бакі сустракаюцца далёка не ўпершыню.**



Па словах Валянціна Рыбакова, у першую чаргу падчас перагавораў абмяркоўваўся канфлікт ва Украіне, і якім чынам, на думку беларускага боку, можна спыніць вайну. Злучаным Штатам было важна даведацца аб меркаванні Аляксандра Лукашэнкі, паколькі ў яго даўно склаліся сяброўскія адносіны з расійскім калегам Уладзімірам Пуціным. Акрамя таго, ён добра ведае і Уладзіміра Зяленскага.

«Самая галоўная ідэя, якая абмяркоўвалася, заключалася ў тым, што проста павінна спыніцца вайна. Павінна спыніцца страляніна, павінна спыніцца гібель людзей. Аб усім у мірны час потым можна дамовіцца», — падкрэсліў беларускі дыпламат.

На сустрэчы разглядаліся не толькі пытанні рэгіянальнага характару, але і сітуацыя ў сферы міжнароднай бяспекі, у прыватнасці напружанне ў адносінах паміж ЗША і Венесуэлай.

«У Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі былі выдатныя адносіны з ранейшым кіраўніцтвам Венесуэлы, з Чавесам, з цяперашнім Прэзідэнтам Мадура. Абмяркоўвалася, якім чынам

рабіць з вайной паміж Расіяй і Украінай, — канкрэтызаваў Джон Коўл. — Гэта добрыя парады».

Што датычыцца прасоўвання працэсу мірнага ўрэгулявання канфлікту ва Украіне і ролі ў гэтым Беларусі, спецпасланнік ЗША ўказаў на фактар даўніх добрых адносін, якія склаліся паміж прэзідэнтамі Беларусі і Расіі Аляксандрам Лукашэнкам і Уладзімірам Пуціным.

«Ваш Прэзідэнт мае вялікую гісторыю адносін з Прэзідэнтам Пуціным, мае магчымасць даваць яму парады, — канстатаваў Джон Коўл. — Гэта вельмі карысна ў гэтай сітуацыі. Яны даўнія сябры і маюць неабходны ўзровень адносін, каб абмяркоўваць такія пытанні. Натуральна, Прэзідэнт Пуцін можа прыняць адны парады і не прыняць іншыя. Гэта спосаб дапамагчы працэсу».

* * *

Аляксандр Лукашэнка перадаў падарункі амерыканскаму лідару Дональду Трампу і яго жонцы Меланіі. Аб гэтым паведамілі ў эфіры тэлеканала «Беларусь 1».

Меланіі Трамп кіраўнік дзяржавы перадаў вытанчаны ювелірны выраб у выглядзе беларускіх васількоў. У ліку падарункаў для першай пары ЗША аказаўся і абраз Мікалая Цудатворца — у Амерыцы гэтага святога вельмі шануюць.

### АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАМІЛАВАЎ 123 ГРАМАДЗЯНІНЫ РОЗНЫХ КРАІН

**У рамках дасягнутых дамоўленасцяў з Прэзідэнтам ЗША Дональдам Трампам і па яго просьбе Прэзідэнт Беларусі памілаваў 123 грамадзяніны розных краін. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

«У рамках дасягнутых дамоўленасцяў з Прэзідэнтам ЗША Дональдам Трампам і па яго просьбе, у сувязі з адменай незаконных санкцый супраць калійнай галіны Рэспублікі Беларусь, уведзеных Адміністрацыяй папярэдняга Прэзідэнта ЗША Байдэна, і ў сувязі з пераходам у практычную плоскасць працэсу адмены іншых незаконных санкцый супраць Рэспублікі Беларусь кіраўніком дзяржавы прынята рашэнне аб памілаванні 123 грамадзян розных краін, асуджаных згодна з законам Рэспублікі Беларусь за ўчыненне злачынстваў рознай накіраванасці — шпіёнскую, тэрарыстычную і экстрэмісцкую дзейнасць», — праінфармавалі ў прэс-службе.

Гэты жэст таксама ажыццёўлены ў сувязі з просьбамі іншых кіраўнікоў дзяржаў і зыходзячы з гуманітарных прынцыпаў, агульначалавечых і сямейных каштоўнасцяў. Ён накіраваны на паскарэнне пазітыўнай дынамікі развіцця ўзаемаадносін з краінамі-партнёрамі Рэспублікі Беларусь і ў інтарэсах стабілізацыі сітуацыі ў еўрапейскім рэгіёне ў цэлым.

Усяго за апошні час з улікам рашэнняў, прынятых Прэзідэнтам Беларусі ў канцы лістапада, агульная колькасць памілаваных асоб складае 156 чалавек. Сярод іх — грамадзяне Вялікабрытаніі, ЗША, Літвы, Украіны, Латвіі, Аўстраліі, Японіі.

## І ЗША ІМКНУЦЦА ДА ПОЎНАЙ ДВУХБАКОВЫХ АДНОСІН»

### перагавораў і інтэрв'ю Прэзідэнта прадстаўніка Беларусі ў ААН тэлеканалу інфармацыйны»

Беларусь і асабіста Аляксандр Рыгоравіч можа паспрыяць таму, каб не пачалася яшчэ адна вайна ў свеце. І Прэзідэнт Беларусі вельмі адкрыта гаварыў з амерыканскай дэлегацыяй на гэту тэму і папярэдзіў аб тым, што ўцягванне Амерыкі ў падобную вайну проста будзе азначаць паўтарэнне В'етнама, што нецікава нікому і не трэба ні амерыканскаму народу, ні венесуэльскаму, ні тым больш усёй сусветнай супольнасці», — раскрыў падрабязнасці перагавораў Валянцін Рыбакоў.

Важнай тэмай сустрэчы стаў двухбаковы парадак дня і ўзаемныя крокі дзвюх краін насустрач адна адной.

Паводле слоў Валянціна Рыбакова, Джон Коўл у час перагавораў з кіраўніком беларускай дзяржавы даў ясна зразумець: канчатковая мэта, якую мае Адміністрацыя Дональда Трампа, — гэта поўная нармалізацыя адносін з Беларуссю. «У гэта паняцце ўваходзіць абсалютна ўсё. Гэта і палітычныя адносіны, і эканамічныя адносіны, і бізнес, які мы можам сумесна развіваць, якім мы можам сумесна займацца, і культура. Гэта ўвесь комплекс нашых узаемаадносін», — канкрэтызаваў пастаянны прадстаўнік Беларусі пры ААН.

Спецпасланніка ЗША Джона Коўла Валянцін Рыбакоў ахарактарызаваў як «прафесійнага, высокакваліфікаванага, вельмі паважанага юрыста і бізнесмена».

У некаторых аналітычных колах ёсць меркаванне, што ЗША, імкнучыся нармалізаваць адносіны з Беларуссю, хочуць такім чынам адарваць яе ад Расіі. Аднак Валянцін Рыбакоў, ведаючы сітуацыю знутры, упэўнены, што гэта не так.

«Вельмі часта мне даводзілася адказваць на пытанне аб тым, ці спрабуюць амерыканцы нейкім чынам паўплываць на нас у нашых узаемаадносінах з Расіяй, — канстатаваў ён. — Я магу вас запэўніць: пра гэта ніколі (я ўжо на шматлікіх перагаворах падобных быў) не заходзіла размова. Ні разу не было ніякіх спроб нейкім чынам нас з Расіяй адзін аднаму супрацьпаставіць, пасварыць і гэтак далей. Амерыканцы, цяперашняя Адміністрацыя, зыходзяць з таго, што ў нас абсалютна цесныя, цёплыя, сяброўскія, сваяцкія, саюзніцкія — якія заўгодна — адносіны з Расійскай Федэрацыяй. І ніякіх спроб умяшацца ў гэтыя ўзаемаадносіны ніколі не было і, я думаю, ніколі не будзе».

Беларускі дыпламат заўважыў, што, калі і няма гучных публічных заяў на двухбаковым трэку, гэта не азначае, што работа не праводзіцца. Па яго словах, сустрэчы з прадстаўнікамі амерыканскіх улад праходзяць практычна штотыдзень.

«У Вашынгтоне мы абмяркоўваем усе пытанні, якія ў нас стаяць на парадку дня, — удакладніў Валянцін Рыбакоў. — Рыхтуем наступныя сустрэчы, рыхтуем наступныя крокі, якія абодва бакі павінны зрабіць на шляху да гэтай самай нармалізацыі, поўнай нармалізацыі нашых двухбаковых адносін».

# «НАША ПРЫНЦЫПОВАЯ ПАЗІЦЫЯ — СВЯТА ВЫКОНВАЦЬ ТОЕ, ШТО МЫ ПААБЯЦАЛІ»

## Прэзідэнт правёў сустрэчу з міністрам замежных спраў Ірана

Аляксандр Лукашэнка выказаў удзячнасць Абасу Аракчы за тое, што кіраўнік знешнепалітычнага ведамства Ірана ў няпростай міжнароднай абстаноўцы знайшоў час, магчымасць наведаць нашу краіну. Па словах кіраўніка дзяржавы, гэта сведчанне таго, што Беларусь — адна з самых блізкіх і сяброўскіх краін для Ірана.

### «ДЛЯ БЕЛАРУСІ ПРЫЯРЫТЭТ ПРЫЯРЫТЭТАЎ — ГЭТА ЭКАНОМІКА»

«Звычайна падчас такіх візітаў (думаю, вы са мной пагодзіцеся) падводзяць пэўныя вынікі і вызначаюць планы на будучыню — рабочыя планы, — канстатаваў Прэзідэнт. — Магчыма, падпісанне або складанне дарожнай карты нашага развіцця на бліжэйшую, больш аддаленую перспектыву. Думаю, што такія планы вы з нашым міністрам (замежных спраў Беларусі. — **«Зв.»**) зможаце сёння і заўтра забяспечыць».



Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на адсутнасць праблем у палітыка-дыпламатычных адносінах паміж дзвюма краінамі. «Але, думаю, таксама пагодзіцеся, асновай усяго з'яўляецца эканоміка, гандлёва-эканамічныя адносіны паміж Беларуссю і Іранам, — канстатаваў кіраўнік дзяржавы. — У гэтым плане, шчыра кажучы, мы з вамі можам зрабіць вельмі многае».

Узгадваючы свае візіты ў Іран пры ранейшых прэзідэнтах гэтай краіны і перагаворы з дзеючым кіраўніком Ісламскай Рэспублікі Масудам Пезешкіянам у Палацы Незалежнасці ў жніўні гэтага года, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ён не выявіў, каб з боку Беларусі не выканалі хоць адзін з пунктаў двухбаковых дамоўленасцяў.

«І гэта наша прынцыповая пазіцыя (мы заўсёды яе прытрымліваемся ў дамоўленасцях з іншымі краінамі) — свята выконваць тое, што мы паабяцалі», — акцэнтаваў увагу беларускі лідар.

Прэзідэнт яшчэ раз падкрэсліў, што для Беларусі прыярытэт прыярытэтаў — гэта эканоміка. «Таму я прапаную не толькі пагаварыць сёння аб гандлёва-эканамічных адносінах з такой вялізнай краінай, якой з'яўляецца Іран, і дзе мы можам многае зрабіць для Ірана (у нас ёсць пэўныя магчымасці, інтарэс), але таксама, можа быць, вызначыць некаторыя кірункі той дарожнай карты, таго плана, які будзе вызначаны на бліжэйшую перспектыву», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы перадаў самыя добрыя віншаванні і пажаданні Вярхоўнаму лідару Ірана Алі Хаменеі і Прэзідэнту Ірана Масуду Пезешкіяну.

### «НАШЫ АДНОСІНЫ ЦАЛКАМ ДРУЖАЛЮБНЫЯ»

У сваю чаргу **міністр замежных спраў Ісламскай Рэспублікі Іран Абас Аракчы** падзякаваў кіраўніку беларускай дзяржавы за сустрэчу. Ён перадаў самыя цёплыя словы прывітання ад Вярхоўнага лідара і Прэзідэнта Ірана, павіншаваў Аляксандра Лукашэнку і ўвесь беларускі народ з надыходзячымі навагоднімі святамі.

«Як вы правільна адзначылі, нашы адносіны цалкам дружалюбныя, няма ніякіх перашкод і праблем, — канстатаваў Абас Аракчы. — Аснова нашага ўзаемадзеяння — эканамічнае супрацоўніцтва, якое развіваецца штодня. Мне здаецца, што ваш візіт у Тэгеран і візіт Прэзідэнта Ірана Масуда Пезешкіяна ў Мінск — гэта сапраўды ключавыя вехі ў развіцці двухбаковага ўзаемадзеяння».

Кіраўнік знешнепалітычнага ведамства Ірана нагадаў, што на мінулым тыдні ў Тэгеране было праведзена 18-е пасяджэнне змешанай беларуска-іранскай міжурадавай камісіі па пытаннях эканамічнага супрацоўніцтва, у якім браў удзел міністр прамысловасці Беларусі Андрэй Кузняцоў. «Гэта было вельмі паспяховае пасяджэнне камісіі, мы вельмі задаволеныя, — звярнуў увагу міністр замежных спраў. — Дасягнуты прадметныя і добрыя дамоўленасці. Я сёння тут для таго, каб са сваім дарагім сябрам (міністрам замежных спраў Беларусі. — **«Зв.»**) пабольш прапрацаваць усе гэтыя пытанні».

## Даслоўна

### «ДВУХБАКОВАЕ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЕ ПАМІЖ НАШЫМІ КРАІНАМІ ЗАЎСЁДЫ РАЗВІВАЕЦЦА ВЕЛЬМІ ПЛЁННА»

У размове з журналістамі **міністр замежных спраў Ісламскай Рэспублікі Іран Абас Аракчы** адзначыў, што сустрэча з Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам прайшла вельмі рэзультатыўна. «Двухбаковае ўзаемадзеянне паміж нашымі краінамі заўсёды развіваецца вельмі плённа. Візіт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у Іран і візіт Прэзідэнта Ірана ў Беларусь — гэта сапраўды тыя ключавыя моманты, якія дапамагаюць нам развіваць наша ўзаемадзеянне», — падкрэсліў ён.

Паводле слоў міністра замежных спраў Ірана, канструктыўнае ўзаемадзеянне паміж краінамі наладжана і з палітычнага пункту гледжання. «Краіны прадуктыўна ўзаемадзейнічаюць на міжнароднай арэне. Па ўсіх пытаннях паміж краінамі праходзяць палітычныя кансультацыі, — звярнуў увагу кіраўнік знешнепалітычнага ведамства. — У нас таксама плённа развіваецца двухбаковае гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва. Гэта ўзаемадзеянне прадстаўлена шырокім спектрам пытанняў».

Пры гэтым Абас Аракчы выказаў меркаванне, што гандлёва-эканамічнае ўзаемадзеянне развіваецца не так добра, як можа. «Ёсць добрыя напрацоўкі ў інвестыцыйнай сферы, у сферы сумеснай вытворчасці. Мы ведаем, што Іран закупляе ў Беларусі ўгнаенні, таму сёння былі прынятыя вельмі важныя рашэнні па ўсіх без выключэння кірунках», — канкрэтызаваў ён.

Міністр замежных спраў Ірана анансаваў, што ў найбліжэйшы час Іран з візітам наведае міністр транспарту Беларусі Аляксей Ляхновіч. «Будуць дасягнуты прадметныя дамоўленасці ў супрацоўніцтве ў транспартна-лагістычнай сферы», — удакладніў Абас Аракчы. Іранскі госць таксама анансаваў перагаворы з міністрам замежных спраў Беларусі Максімам Рыжанковым, па заканчэнні якіх будуць падпісаны важныя дакументы. «І адзін з іх — праграма ўзаемадзеяння паміж міністэрствамі замежных спраў дзвюх краін на 2026 — 2030 гады», — сказаў ён.

Міністр замежных спраў Ісламскай Рэспублікі Іран таксама нагадаў аб дарожнай карце ўсебаковага супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Іранам на 2023 — 2026 гады — дакуменце, які ахоплівае вельмі шырокі спектр двухбаковага ўзаемадзеяння. У сувязі з гэтым Абас Аракчы адзначыў: «Наша супрацоўніцтва значна шырэйшае і ахоплівае вельмі шмат розных абласцей».

**Па паведамленнях нашых карэспандэнтаў і БелТА.**

# «МОЦНЫЯ ДАМАЎЛЯЮЦЦА З МОЦНЫМІ»

## Эксперты — пра вынікі перагавораў Прэзідэнта Беларусі са спецпасланнікам ЗША ў нашай краіне Джонам Коўлам

У суботу вынікі беларуска-амерыканскіх перагавораў, якія два дні праходзілі ў Палацы Незалежнасці, не толькі сталі галоўнай навіной для нашай краіны, але і трапілі ў стужкі вядучых сусветных інфармагенцтваў. Экспертная ж супольнасць працягвае іх абмеркаванне, і ўсе адзначаюць моцную і паслядоўную пазіцыю Прэзідэнта Беларусі ў адстойванні інтарэсаў нашай краіны.

### «ЛУКАШЭНКА — ЧАЛАВЕК БЕЗ ПАДВОЙНАГА ДНА І ЗАЎСЁДЫ ТРЫМАЕ СЛОВА»



Тэма нармалізацыі беларуска-амерыканскіх адносін паступова пераходзіць у практычную фазу. Усё больш прыкмет сведчаць аб узаемнай гатоўнасці бакоў да руху наперад. **Намеснік начальніка факультэта Генштаба УС Ваеннай акадэміі Беларусі Андрэй БАГАДЗЕЛЬ** падзяліўся меркаваннем на гэты конт у эфіры «Першага інфармацыйнага»:

— Я думаю, што варта чакаць нармалізацыі адносін, па-за ўсякім сумневам. Бо Коўл першы загаварыў аб пераходзе ад гэтых самых лагічных крокаў да ўпэўненай хады. Значыць, гэта ўзаемна, і амерыканцам гэта трэба. А мы не супраць. Сёння Прэзідэнт Беларусі мае цесныя сувязі не толькі з Уладзімірам Уладзіміравічам Пуціным, але, давайце скажам прама, гэта адзіны лідар Еўропы, які мае блізкія даверныя адносіны з лідарамі, якія ўплываюць на лёс чалавецтва. Гэта і Уладзімір Уладзіміравіч Пуцін, і Сінь Цзіньпін, і Дональд Трамп.

Ваенны аналітык адзначыў, што Лукашэнка сёння — той самы мудры палітык, які палітычнай разоры не сапсуе. Самая галоўная яго рыса, што ён ніколі не ўвільвае, гаворыць прама, чалавек без падвойнага дна і заўсёды трымае слова.

— А вось такая рыса сёння ў палітыкаў сустракаецца вельмі рэдка. Але яна вельмі цэніцца і ў Расіі, і ў Кітаі, і апошнім часам у ЗША. Таму да Аляксандра Рыгоравіча сёння прыслухоўваюцца, прымаюць як самага блізкага чалавека, прычым у сябе дома, і нават могуць пацэлефанаваць з самалёта ў цяжкую хвіліну, — рэзюмаваў эксперт.



— Словы нашага Прэзідэнта не разыходзяцца са справай. Ён неаднаразова падкрэсліваў, што мы гатовы да ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва, гатовы заключаць узаемавыгадныя здзелкі. І вызваленне чарговых 123 зняволеных з розных краін сведчыць аб тым, што Беларусь настроена на развіццё супрацоўніцтва з іншымі дзяржавамі, калі яны робяць крокі насустрач, — цытуе БелТА **намесніка старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы і культуры Палаты прадстаўнікоў Вячаслава ДАНІЛОВІЧА.**



Яго калега па Палаце прадстаўнікоў **член Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Анатоль БУЛАЎКА** ў эфіры тэлеканала АНТ адзначыў яшчэ і той момант, што амерыканцы вядуць перагаворы з намі на роўных — як моцны з моцным.

— Слабымі, як правіла, маніпулююць. І тое, што мы бачылі ў сродках масавай інфармацыі, — самае яркае таму пацвярджэнне. Кіраўнік нашай дзяржавы цалкам зразумела і відавочна мае вельмі вялікую геапалітычную вагу на сусветнай арэне. З ім лічацца, з ім раяцца, да яго парад прыслухоўваюцца, яго парады збываюцца. І гэта галоўнае. Усё астатняе — элементы працэсу, які, на мой погляд, будзе ў далейшым развівацца і ўдасканальвацца. І ў канчатковым выніку, упэўнены, прывядзе да таго, што наша краіна будзе на роўных супрацоўнічаць з тымі ж ЗША, — адзначыў парламентарый.

### ПЕРШ ЗА ЎСЁ — НАШЫ НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ ІНТАРЭСЫ



Беларусь актыўна рыхтуецца да Усебеларускага народнага сходу. Асаблівая ўвага будзе аддадзена Праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця на будучую пяцігодку. Як лічыць **медыяэксперт Дзмітрый ШВАЙБА**, пасляховая работа кіраўніка дзяржавы па знешнепалітычнай лавесцы, у тым ліку перагаворы з амерыканцамі, — таксама важны фактар у яе ажыццяўленні.

— Сацыяльна-эканамічная ўстойлівасць грунтуецца на ўстойлівым і перспектыўным развіцці прамысловасці і рэальнага сектара эканомікі, — патлумачыў ён сваю думку ў эфіры «Першага інфармацыйнага». — Падзеі апошняга часу працавалі на гэта: у першую чаргу актыўны графік кіраўніка дзяржавы ў частцы наведвання краін далёкай дугі, пазітыўныя перспектывы развіцця гэтых узаемаадносін, плюс сур'ёзныя перагаворныя пазіцыі нашай краіны з амерыканскім бокам.

— Безумоўна, ЗША з'яўляюцца найбуйнейшай эканомікай свету. Безумоўна, яны ўплываюць на вельмі многія працэсы, у тым ліку на фінансавы рынак, на экспартныя працэсы, на лагістычныя працэсы. І ўсяму свету прыйшоў вельмі выразны сігнал: Беларусь дамовілася, — падкрэсліў Дзмітрый Швайба. — І вось з гэтай пазіцыі можна смела выходзіць да беларускага народа. А гэта ж не толькі зварот кіраўніка дзяржавы да Усебеларускага народнага сходу, да яго дэлегатаў, гэты зварот да ўсяго беларускага народа. І ў гэтым сэнсе, вядома, пазітыў цалкам відавочна выбудоўваецца. Гэта відавочныя дасягненні. Іх нельга недаацаніць. Беларускае грамадства павінна ацаніць той трэк, на які выйшла наша краіна дзякуючы асабістым намаганням кіраўніка дзяржавы.



— Беларусь у дадзеным выпадку карыстаецца магчымасцю наладзіць адкрыты, без прадузятасцяў двухбаковы дыялог з амерыканцамі для абароны сваіх нацыянальных інтарэсаў, — гаворыць **палітолаг Аляксей ДЗЕРМАНТ** у публікацыі ў адным з расійскіх СМІ. — І яны вельмі зразумелыя: зняцце ўсіх незаконных санкцый, уплыў на саюзнікаў ЗША ў рэгіёне для зніжэння ўзроўню ваенна-палітычнай напружанасці, якая пагражае прамым сутыкненнем з Польшчай і Літвой.

Амерыканцы, калі верыць у шчырасць іх намераў завяршыць канфлікт на Украіне, таксама разумеюць, што без Беларусі, у тым ліку і як часткі Саюзнай дзяржавы, наўрад ці ўдасца дасягнуць устойлівай архітэктуры бяспекі ў рэгіёне, лічыць эксперт. «Беларускі балкон» істотным чынам уплывае на раўнавагу сіл, і гэта трэба абавязкова ўлічваць, калі сапраўды імкнуцца да ўстойлівага міру і ваенна-палітычнага балансу».

### ЗНЯЦЦЕ САНКЦЫЙ З НАШАГА КАЛІЮ АДАБ'ЕЦЦА НА ГЛАБАЛЬНАЙ ХАРЧОВАЙ БЯСПЕЦЫ



Праблема ўгнаенняў актуальная для ўсёй планеты, насельніцтва якой павялічваецца. Як заўважыў **дэкан факультэта журналістыкі БДУ палітолаг Аляксей БЯЛЯЕЎ** у эфіры «Альфа Радыё», сёння з-за змены геапалітычных раскладаў з недахопам угнаенняў сутыкнуліся многія краіны, у тым ліку ЗША.

— Пазіцыя, напрыклад, амерыканскага кіраўніка Дональда Трампа па адстойванні інтарэсаў ЗША прывяла да ўскладнення адносін з Канадай, якая якраз спрабавала выцесніць Беларусь з калійных рынкаў, — заявіў палітолаг. — Яна таксама з'яўляецца буйным вытворцам калійных угнаенняў. Цяпер ЗША спатрэбіліся беларускія ўгнаенні, і яны будуць іх закупляць. І зразумела, што, гледзячы на Амерыку, задумаюцца і іншыя.

Аляксей Бяляеў адзначыў, што зняцце санкцый з «Беларуськалія» аблягчае сітуацыю на міжнародным рынку, стварае магчымасць для зніжэння цэн, гэта значыць, прыносіць выгаду ўсім, а не толькі Беларусі.

— Хоць нам прыемна, што мы сваю пазіцыю не мянялі, а тыя, хто ўводзілі супраць нас незаконныя санкцыі, цяпер вымушаны прызнаць, што гэта было абсалютнай дурасцю і нанесла вялізную шкоду не столькі Беларусі, колькі ўсяму свету, — рэзюмаваў эксперт.



**Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Аляксандр ШПАКОЎСКІ** ў сваім тэлеграм-канале заўважае:

— Вынікі беларуска-амерыканскіх перагавораў адпавядаюць чаканням афіцыйнага Мінска. Зняцце амерыканскіх санкцый з айчыннай калійнай галіны — рашэнне стратэгічнага парадку, якое спрыяльна адаб'ецца на стане сусветнага рынку ўгнаенняў і глабальнай харчовай бяспекі.

Акрамя таго, лічыць ён, пасля зняцця санкцый ЗША ў дачыненні да беларускага калію няма ніякіх падстаў для іншых незаконных рэстрыкцый супраць Беларусі.

— Натуральна, ва ўмовах захавання і ўзмацнення жорсткасці санкцыйнай палітыкі ЕС агульная сітуацыя для Беларусі застаецца складанай, аднак скасаванне амерыканскіх санкцый істотна палегчыць становішча нашай краіны на міжнароднай арэне, — адзначыў дэпутат.

Ён звяртае ўвагу на тое, што дзеянні прэзідэнта накіраваны на максімальнае ўмацаванне суверэнітэту Беларусі, у аснове якога знаходзіцца экспартна-арыентаваная эканоміка.

У часткі іншых гучных падзей беларуска-амерыканскіх перагавораў Аляксандр Шпакоўскі канстатаваў:

— Што датычыцца «адпушчаных» злачынцаў: калі наша грамадства сапраўды кансалідаванае вакол каштоўнасці дзяржаўнага суверэнітэту, сацыяльна-арыентаванай беларускай мадэлі развіцця і фігуры нацыянальнага лідара Аляксандра Лукашэнкі, то асцерагацца выхаду на свабоду нейкіх дэструктыўных элементаў абсалютна не варта. Як відаць з мінулай практыкі, вызваленне з месцаў зняволення палітычных экстрэмістаў з калісьці «гучнымі» імёнамі не аказала якога-небудзь прыкметнага ўплыву на ўнутранае становішча ў краіне і сітуацыю ў сферы нацыянальнай бяспекі.

### НОВЫ ПОГЛЯД НА ВЫБУДОЎВАННЕ АДНОСІН У ШМАТПАЛЯРНЫМ СВЕЦЕ



Так называе перагаворы паміж Беларуссю і ЗША **эксперт па нацыянальнай бяспецы Аляксандр ЦІШЧАНКА** ў сваёй публікацыі на партале sb.by.

— Зразумела, што Беларусь і ЗША, па сутнасці, — гэта ідэалагічныя антаганісты, але вось узялі ж і знайшлі спосаб, як пачаць дамаўляцца. Нават склалі дарожную карту выхаду з крызісу адносін да апошняй санкцыі. У гэтым ужо ёсць пэўная ўнікальнасць, — адзначае эксперт. — І можна дакладна сказаць, што Мінск стаў стартавай пляцоўкай вываду на арбіту новай амерыканскай стратэгіі нацыянальнай бяспекі ў плане аднаўлення стабільнасці і зніжэння рызык у адносінах нават з тымі, каго ЗША раней называлі ворагамі.

І ў гэтай з'яве ёсць нават свой тэрмін — тэхнічная дыпламатыя.

— Гэта калі такія бар'еры, як ідэалогія, каштоўнасці і прынцыпы застаюцца некранутымі, а праблема вырашаецца, — тлумачыць Аляксандр Цішчанка. — Тут галоўнае слова «вырашаецца». Менавіта гэтую лінію ўдалося беларускаму Прэзідэнту літаральна ўжывіць у трансатлантычную рыторыку.

Гэта ж, па вялікім рахунку, новы погляд на тэхналогіі будаўніцтва адносін ва ўмовах шматпалярнага светаўладкавання, — лічыць эксперт. — Гэта нават болей. Гэта прыклад і сігнал тым жа Украіне і Еўропе, як можна выйсці з тупіку наратываў. Гэта і ёсць тыя самыя рэалізм і прагматыка ў дзеянні, а не наратыўныя «шматвектарнасць» або «ціск», якімі спрабуюць пракаментаваць мінскі вынік. Гэта хутчэй элегантны адыход ад бессэнсоўнай эскалацыі і выдатная дэманстрацыя таго, як можна разумець адзін аднаго, нават думаючы на розных мовах.

І калі ідэалагічныя штампы і наратывы, навязаныя прапагандай заходняму грамадству, адкладаюцца ў бок, то і ўсё адразу становіцца на свае месцы.

— Аляксандр Лукашэнка лёгка прызнаецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь па праве выбару беларускага народа, «палітвязні» — усяго толькі асуджаныя за злачынствы ў рамках крымінальна-працэсуальнага заканадаўства, заходнія санкцыі набываюць статус незаконных, а беларускі калій адразу бачыцца па-за палітыкай, — тлумачыць Аляксандр Цішчанка.

І як бы сёння ні стараліся зласліўцы зніверыраваць вынікі беларуска-амерыканскіх перагавораў, факт застаецца фактам: прайграўшых няма, канстатуе эксперт: «Было шмат зацікаўленых. Усе задаволены. З гэтым усім давядзецца мірыцца, лічыцца і гэтаму ўсё роўна давядзецца вучыцца ўсім. Беларусь з Амерыкай падаюць у гэтай справе добры прыклад. І вельмі хочацца, каб ён стаў паказальным для іншых».

# КРАІНА ЯК ВЯЛІКАЯ СЯМ'Я

**У самым сэрцы Гомеля сярод агнёў, музыкі і дзіцячага смеху быў дадзены чарговы старт добрай традыцыі, якая ўжо больш за тры дзесяцігоддзі аб'ядноўвае Беларусь, — рэспубліканскай навагодняй дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці».**


Фота БелТА.

## АКАДЭМІЯ ДОБРЫХ СПРАЎ І ПЕРШЫЯ ЖУРНАЛІСЦКІЯ КРОКІ

Галоўнай сцэнай свята стала Акадэмія добрых спраў. У гэтай сімвалічнай навагодняй прасторы, што разгарнулася на тэрыторыі Гомельскага палацава-паркавага ансамбля быў адкрыты «навагодні семестр». У прамым эфіры да свята далучыліся ўсе рэгіёны краіны.

Ад Брэста да Віцебска, ад Гродна да Магілёва — мары дзяцей з усёй Беларусі ўвасобіліся ў кнігах Бібліятэкі дабрыні, у якой кожная вобласць была прадстаўлена сваім чароўным фаліянтам.

На свяце Гомельшчыну прадстаўлялі каля 350 дзяцей з усіх куткоў вобласці. Іх аб'яднала не толькі чаканне вялікага свята, вера ў навагоднія цуды, але і жаданне павіншаваць жыхароў краіны з надыходзячымі Новым годам і Калядамі.

— Жадаю, каб усе сустрэлі Новы год у любові і шчасці, каб здзейсніліся самыя запаветныя мары, — ад імя вучняў сярэдняй школы № 1 г. Веткі імя А. А. Грамыкі перадала пажаданні Ганна Бартноўская.

— Для нас вялікі гонар удзельнічаць у такім свяце. У новым годзе жадаю ўсім беларусам моцнага здароўя, — павіншавала ўдзельніца акцыі, вучаніца сярэдняй школы № 75 г. Гомеля Ксенія Мялешка.

Не толькі паўдзельнічаць у «Практыкуме добрай энергіі» — гульнях з аніматарамі і вясёлымі памочнікамі Ф'ёкамі, — але і правесці свой першы жывы рэпартаж з адкрыцця акцыі «Нашы дзеці» прыехалі ў Гомель школьнікі з Добруша.

— З пачатку года ў нас пачаў працаваць медыяцэнтр. Мы ўдзельнічалі ў конкурсах, а сёння атрымалі першае вялікае і адказнае заданне — амаль у прамым эфіры весці рэпартаж, браць інтэрв'ю ў удзельнікаў, — падзяліліся выхаванцы Добрушскага раённага цэнтра дадатковай адукацыі Вераніка Смірнова і АляксейКанавалаў. — Жадаем усім радасці, міру і дабра!

## «ДЗЯРЖАВА — ГЭТА ВЯЛІКАЯ СЯМ'Я»

Гасцямі Акадэміі добрых спраў у самым сэрцы Гомеля сталі намеснік Прэм'ер-міністра Наталля Пяткевіч, старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван Крупко, міністр адукацыі Андрэй Іванец і старшыня Праўлення Беларускага дзіцячага фонду Людміла Кандрашова.

Адкрываючы акцыю, **намеснік Прэм'ер-міністра Беларусі Наталля ПЯТКЕВІЧ** падкрэсліла, што ўдзел дзяржавы ў арганізацыі такіх маштабных свят — паказчык высокага ўзроўню развіцця краіны, асаблівай значнасці пытанняў развіцця і абароны дзяцінства.

— Сёння акцыя праводзіцца ўжо 31-ы раз. Адной з першых задач, пастаўленых кіраўніком дзяржавы, было стварэнне цэласнай дзяржаўнай сістэмы абароны дзяцінства, аховы мацярынства і вырашэння ўсіх праблем, звязаных з дзецьмі. Калі пачыналася акцыя з падтрымкі дзіцячых дамоў і дзяцей-сірот, то сёння гэта ініцыятыва, якая ахоплівае ўсю краіну, — адзначыла Наталля Пяткевіч.

Яна таксама нагадала, што ў свой час у Беларусі было прынята прынцыповае рашэнне — адыходзіць ад дзіцячых дамоў і развіваць сямейныя формы выхавання. За гэтыя гады колькасць дзяцей у дзіцячых дамах скарацілася ў шэсць разоў, а колькасць саміх устаноў — у пяць. Сёння іх засталося каля дзесяці.

— Новы год — гэта час, калі трэба прыходзіць з падарункамі. Але з падарункамі, якія сапраўды вырашаюць праблемы, — выказала ўпэўненасць Наталля Пяткевіч. — На мой погляд, гэтая акцыя ўжо стала часткай нашай традыцыі, часткай нашай культуры. І, магчыма, мы не заўсёды гэта ўсведамляем, але ёсць яшчэ адна, найважнейшая мэта: падтрымка сямейных каштоўнасцяў. Калі дарослыя і дзеці разам удзельнічаюць у свяце, мы паказваем дзецям мадэль паводзін, фарміруем культуру сумеснага свята — калі яно ствараецца ўсёй сям'ёй, усёй краінай, рознымі пакаленнямі. Гэта, на мой погляд, абсалютна бліскучая ідэя Прэзідэнта — звязаць акцыю «Нашы дзеці» з другім дзяржаўным праектам, накіраваным на падтрымку пажылых



людзей. Тым самым мы яшчэ раз паказваем, што дзяржава — гэта вялікая сям'я, якая клапоціцца аб кожнай катэгорыі насельніцтва, — на важныя пасылы марафонаў дабра звярнула ўвагу намеснік Прэм'ер-міністра Беларусі.

Па словах Наталлі Пяткевіч, не менш важна, як акцыя «Нашы дзеці» зараджае пазітыўнымі эмоцыямі ўсіх незалежна ад узросту, а прадстаўнікі рэгіёнаў, кіраўнікі, службовыя асобы выходзяць за межы фармальнасці, становяцца часткай свята, праяўляюць шчырасць і жывы ўдзел.

## ТЭРЫТОРЫЯ НАВАГОДНЯГА ЦУДУ

Гомельскую вобласць як тэрыторыю навагодняга цуду на свяце прадставіў **старшыня аблвыканкама Іван КРУПКО.** Акцыя «Нашы дзеці», як перакананы кіраўнік Гомельскага рэгіёна, сапраўды, любімая не толькі дзецьмі, але і дарослымі, аб'ядноўвае, робіць людзей бліжэй.

У гэтыя перадсвяточныя дні, як падкрэсліў Іван Крупко, падрыхтавана мноства святочных лакацый. Чакаюць дзяцей і іх бацькоў навагоднія ёлкі, рэзідэнцыі Дзеда Мароза, дзе кожнае дзіця можа загадаць жаданне і атрымаць падарунак. Асаблівае месца займае нацыянальны парк «Прыпяцкі» і рэзідэнцыя Дзеда Мароза — прастора, дзе прырода, казка і дзіцячыя мары зліваюцца ў адно цэлае.

Старт далейшым навагоднім мерапрыемствам, тысячам сустрэч, здзейсненым жаданням і новым гісторыям Акадэміі добрых спраў шаноўныя госці акцыі далі, націснуўшы сімвалічную кнопку запуску рэспубліканскай навагодняй дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці».

## КЛОПАТ, ЯКІ ПРАЦЯГВАЕЦЦА ШТОДНЯ

У дзень адкрыцця марафона дабрыні ў Гомелі Наталля Пяткевіч таксама наведала Гомельскі абласны цэнтр карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі. Аб умовах навучання і рэабілітацыі дзяцей з цяжкімі і множнымі парушэннямі развіцця, сучаснымі падыходамі да іх суправаджэння і сацыялізацыі распавяла дырэктар установы Марыя Лятошка.

Так, адным з ключавых напрамкаў работы з дзецьмі дашкольнага і школьнага ўзросту тут з'яўляецца выкарыстанне альтэрнатыўных сродкаў камунікацыі — спецыяльных картак, камунікатыўных набораў, так званых «гаворачых кнопак» і іншых дапаможных сродкаў, якія дапамагаюць дзіцяці з цяжкімі і множнымі парушэннямі развіцця пачаць камунікаваць, а дарослым — навучыцца яго разумець.

— Для такіх дзяцей камунікацыя — гэта ключ да сацыялізацыі і навучання. Наша задача — падабраць для кожнага менавіта той спосаб зносін, які дазволіць яму быць пачутым, — звярнула ўвагу на ўмовы навучання і рэабілітацыі ва ўстанове намеснік дырэктара Гомельскага абласнога цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі Таццяна Грыневіч.

Па яе словах, вельмі важна, што ў цэнтры карыстанню камунікатыўнымі сродкамі навучаюць не толькі спецыялістаў, але і бацькоў. Так дзіця можа ўзаемадзейнічаць не толькі з педагогамі, але і дома — з мамай, татам, блізкімі... Калі сям'я размаўляе з дзіцем «на адной мове», гэта дае зусім іншы вынік, падкрэсліваюць спецыялісты.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.**

---

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# ВЕДЫ Ў ПАДМУРКУ ДАБРАБЫТУ

## У Нацбанку адзначылі ўдзельнікаў і пераможцаў фіналу рэспубліканскай алімпіяды па фінансавай адукаванасці сярод школьнікаў

Алімпіяда праходзіла ў верасні—снежні. У чатырох этапах свае фінансавыя веды праверыла амаль 29 тысяч маладых людзей з 2354 устаноў агульнай сярэдняй адукацыі ўсіх рэгіёнаў краіны.

У падвядзенні вынікаў і цырымоніі ўзнагароджання ўдзельнічаў **старшыня праўлення Нацыянальнага банка Раман ГАЛОЎЧАНКА.** Ён, у прыватнасці, адзначыў, што за час усіх фінансавых алімпіяд за прызы змагалася 216 тысяч юнакоў і дзяўчат з усёй краіны. А вынікі алімпіяды сведчаць аб росце канкурэнцыі і паступальным развіцці фінансавых ведаў і навыкаў навучэнцаў. «Гэтыя веды ляжаць у аснове фінансавага дабрабыту любога чалавека», — лічыць Раман Галоўчанка.

У фінале алімпіяды ў другую пятніцу снежня першае месца заняла Уладзіслава Талочка (гімназія № 41 Мінска). Пераможца ўзнагароджана дыпломам I ступені і грашовым прызам у памеры 1500 беларускіх рублёў. Дыплом II ступені і грашовы прыз у памеры 1250 беларускіх рублёў — у Аляксандра Ралёнка (сярэдняя школа № 16 з Полацка), дыплом III ступені і грашовы прыз у памеры 1000 беларускіх рублёў — у Івана Казыры (сярэдняя школа № 1 Валожына).

Удзельнікі заключнага этапу алімпіяды, якія не занялі прызавыя месцы, узнагароджаны грашовымі прэміямі ў памеры 350 беларускіх рублёў і дыпломамі фіналістаў. Таксама грашовымі прэміямі ў памеры 400 беларускіх рублёў адзначаны настаўнікі, якія падрыхтавалі пераможцу і прызёраў. Дарэчы, усе дыпломы і кубкі пераможцам уручаў асабіста кіраўнік Нацбанка.

Алімпіяда праводзіцца Нацыянальным банкам і Міністэрствам адукацыі краіны штогод з 2014 года і з'яўляецца адным з найбольш маштабных нацыянальных мерапрыемстваў па павышэнні фінансавай граматнасці. Яе асноўная мэта — папулярызацыя ведаў у галіне фінансаў, фарміраванне ў вучняў практычных навыкаў выкарыстання фінансавых інструментаў, развіццё фінансавай культуры моладзі.

Алімпіядныя заданні накіраваны на праверку ведаў па тэмах, без якіх немагчымы ўзважаныя фінансавыя паводзіны ў сучасным грамадстве, — планаванне асабістага і сямейнага бюджэту, зберажэнні і крэдытаванне, лічбавы банкінг і бяспека ў фінансавай сферы, інвестыцыі, страхаванне, падаткі, разлікі і вылічэнні, якія датычацца фінансаў.

Раман Галоўчанка адзначыў, што на алімпіядзе прапанаваліся тэставыя заданні з наборам пэўных адказаў па самым шырокім спектры тэм: планаванне асабістых фінансаў, фінансавыя актывы, асновы кібербяспекі пры рабоце з фінансамі. Было і творчае заданне. У дадзеным выпадку яно было прысвечана такім актуальным пытанням, як бяспека пры рабоце з плацежнымі карткамі і як не патрапіць на вуду махляроў. А пры падвядзенні вынікаў трэба было ацаніць шырыню пагляду ўдзельнікаў і, вядома ж, іх творчы патэнцыял, наколькі яны раскрываюць уласную індывідуальнасць праз выкананне такіх заданняў.

Пераможца алімпіяды Уладзіслава Талочка расказала, што ў школе прапанавалі паўдзельнічаць у ёй летась. «Я таксама дайшла да рэспубліканскага этапу, але не ўдалося перамагчы», — растлумачыла яна.

Бронзавы прызёр Іван Казыра падзякаваў настаўніцы, якая падштурхнула яго да ўдзелу. «Яна мне прапанавала ў восьмым класе схадзіць на алімпіяду, і вось з таго часу пастаянна ўдзельнічаю. Кожны дзень вельмі доўга рыхтаваўся — мінімум чатыры гадзіны. Асабліва сёлета была вельмі ўпорная падрыхтоўка. І гэта дало свой плён», — адзначыў шчаслівы ўладальнік трэцяга месца.

**Сяргей КУРКАЧ.**

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
информирует о проведении электронных торгов
по продаже имущества, принадлежащего
**РУП «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»** (Продавец).

**Электронные торги состоятся 16.01.2026.**

**Лот № 1:** MITSUBISHI L200, кузов (рама) № MMCJNKB40DDZ06188, 2012 г. в.
Начальная цена с учетом НДС 20 % – 9 332,34 руб.

**Лот № 2:** Спутниковый GNSS приемник Leica GS08plus, серийный № 2526483, 2012 г. в.
Начальная цена с учетом НДС 20 % – 3 220,54 руб.

**Лот № 3:** Спутниковый GNSS приемник Leica GS08plus, серийный № 1857281, 2016 г. в.
Начальная цена с учетом НДС 20 % – 2 766,32 руб.

**Лот № 4:** Спутниковый GNSS приемник Leica GS08plus, серийный № 1852013/252288, 2013 г. в.
Начальная цена с учетом НДС 20 % – 3 515,05 руб.

**Лот № 5:** Спутниковый GNSS приемник Leica GS08plus, серийный № 1857284, 2016 г. в.
Начальная цена с учетом НДС 20 % – 2 766,32 руб.

**Лот № 6:** Тахеометр Trimble Total Station M3, серийный № 131116, 2007 г. в.
Начальная цена с учетом НДС 20 % – 1 644,08 руб.

**Лот № 7:** Приемник Leica GPS 1230 для полевых измерений K-3, серийный № 320235, 2010 г. в.
Начальная цена с учетом НДС 20 % – 3 952,67 руб.

**Лот № 8:** Приемник Leica GPS 1230 для полевых измерений K-3, серийный № 320243, 2010 г. в.
Начальная цена с учетом НДС 20 % – 3 830,98 руб.

**Лот № 9:** Приемник Leica GPS 1200 для полевых измерений K-6, серийный № 320234, 2010 г. в.
Начальная цена с учетом НДС 20 % – 4 028,42 руб.

**Лот № 10:** Тахеометр Trimble Total Station M35, серийный № 130667, 2007 г. в.
Начальная цена с учетом НДС 20 % – 1 644,08 руб.

**Лот № 11:** Тахеометр электронный Trimble M3, серийный № 130667, 2008 г. в.
Начальная цена с учетом НДС 20 % – 1 852,60 руб.

**Лот № 12:** Резак гильотинного типа IDEAL 4705, серийный № 4850617290091402, 2012 г. в.
Начальная цена с учетом НДС 20 % – 3 290,88 руб.

**Лот № 13:** Автоматическая биговальная машина с ручной подачей SABTEC CR-370, серийный № 0221, 2020 г. в.
Начальная цена с учетом НДС 20 % – 7 859,23 руб.

**Лот № 14:** Термоклеевой аппарат BW-M40, серийный № 20200062, 2020 г. в.
Начальная цена с учетом НДС 20 % – 4 078,04 руб.

Местонахождение Лотов №№ 1-14:
г. Минск, ул. Папанина, 7

Извещение о проведении электороннных торгов размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by, au.nca.by и на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by)

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего
**ОАО «Авиакомпания Гродно»** (Продавец)

**Электронные торги состоятся 29.12.2025**

**Лот № 1: Планер Ан-2 EW84727**
(Инв. №0000001175, тип АТ и рег. знак – Ан-2с/х EW-84727, заводской № 1Г20145, 1983 г., установлены: авиационный двигатель АШ-62ИР (Заводской № К1623101, инв. № 0000011072), воздушный винт АВ-2 (Заводской № Н062300480)
Начальная цена с НДС 20 % – 55 568,09 руб.
Задаток – 5 556,81 руб.

**Лот № 2: Планер Ан-2 EW 07428**
(Инв. № 0000001169, тип АТ и рег. знак – Ан-2П EW-07428, заводской № 1Г15103, 1973 г., укомплектован: авиационный двигатель АШ-62ИР (Заводской №16282149, инв. № 0000001246), воздушный винт АВ-2 (Заводской № W478034).
Начальная цена с НДС 20 % – 46 014,84 руб.
Задаток – 4 601,48 руб.

**Местонахождение Лотов №№ 1, 2:**
Республика Беларусь, Гродненская обл., Гродненский р-н, Аэропорт.

**Шаг электронных торгов** – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП). Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **23.12.2025 в 16.00.**

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by.**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

# КАНКРЭТЫЗУЮЧЫ І ЎДАКЛАДНЯЮЧЫ

## На чарговым пасяджэнні трэцяй сесіі Палаты прадстаўнікоў разгледзелі шэраг законапраектаў

Асноўная ўвага была ўдзелена законапраектам, якія закранаюць змяненні ў сферах энергазберажэння, прадпрымальніцтва і пенсіённага забеспячэння. Таксама разгледзелі законапраекты «Аб ратыфікацыі міжнародных дагавораў» і «Аб ратыфікацыі Канвенцыі аб заснаванні Міжнароднай арганізацыі па медыяцыі».

### «АБ РАТЫФІКАЦЫІ МІЖНАРОДНЫХ ДАГАВОРАЎ»

Прапанаваныя дакументам новаўвядзенні заключаны ў спрашчэнні працэдуры спагнання аліментаў на непаўналетніх дзяцей сярод грамадзян краін — падпісантаў Канвенцыі аб прававой дапамозе ў крымінальных, сямейных і адміністрацыйных справах. Дарэчы, аліменты можна будзе спагнаць не толькі па рашэнні суда пасля паўнацэннага разбору, але і на падставе судовага загаду — без выкліку бакоў на пасяджэнне, растлумачыў **член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Андрэй АНІСІМАЎ**. Таму, хто спаганяе аліменты, больш не давядзецца асабіста ехаць у іншую краіну для падачы заявы — дастаткова накіраваць дакументы для афармлення. Гэта асабліва актуальна, калі ён, напрыклад, пражывае ў Беларусі, а даўжнік — на тэрыторыі Расіі.



### «АБ РАТЫФІКАЦЫІ КАНВЕНЦЫІ АБ ЗАСНАВАННІ МІЖНАРОДНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ ПА МЕДЫЯЦЫІ»

Медыяцыя як спосаб вырашэння канфліктаў усё больш актыўна набірае папулярнасць у свеце, і наша краіна не выключэнне. У Беларусі дзейнічае каля 1400 атэставаных медыятараў — як юрыстаў, так і прадстаўнікоў іншых прафесій, галоўная задача якіх — дапамагчы бакам дамовіцца, знайсці ўзаемапрымальны варыянт без абавязковага прыцягнення дзяржаўных структур. Штогод у краіне заключаецца каля 1500 медыятыўных пагадненняў, прычым гэты спосаб урэгулявання канфліктаў запатрабаваны як у бізнес-асяроддзі, так і, напрыклад, у сямейных спрэчках.

Канвенцыя заклікана паспрыяць вырашэнню канфліктаў самага рознага ўзроўню: паміж дзяржавамі, дзяржавай і прыватнай асобай, а таксама паміж камерцыйнымі кампаніямі. Як растлумачыў **міністр юстыцыі Яўген КАВАЛЕНКА**, ініцыятыва стварэння адпаведнай міжнароднай арганізацыі належыць Кітаю, а Беларусь увайшла ў лік краін-заснавальніц. «Мы аднымі з першых далучыліся да гэтай работы, актыўна ўдзельнічалі ў падрыхтоўцы міжнароднага дагавора і былі аднымі з першых падпісантаў», — падкрэсліў міністр юстыцыі. На дадзены момант канвенцыю падпісала ўжо больш за 30 дзяржаў, з якіх каля дзесяці завяршылі яе ратыфікацыю.



### «АБ ЗМЯНЕННІ ЗАКОНА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ «АБ ЭНЕРГАЗБЕРАЖЭННІ»

Законапраект, прыняты ў другім чытанні, як растлумачыў **член Пастаяннай камісіі па прамысловасці, энергетыцы, транспарце, сувязі і лічбавым развіцці Антон КАРАНКЕВІЧ**, уводзіць адзіныя правілы для ўсіх юрыдычных асоб, устараняючы існуючую раней няроўнасць паміж дзяржаўнымі і прыватнымі арганізацыямі. Раней для апошніх неабходна было толькі ўстанавіць нарматывы, калі для дзяржаўных арганізацый патрабавалася іх яшчэ і ўзгадніць. Цяпер падыход стане адзіным — устанаўленнем норм для ўсіх зоймецца Дэпартамент па энергаэфектыўнасці Дзяржстандарту.



Яшчэ адна змена датычыцца экспертнай ацэнкі — законапраект ліквідуе асобную экспертызу энергаэфектыўнасці аб'ектаў, аб'ядноўваючы яе з экспертызай горадабудаўнічых аб'ектаў. Гэта дасць магчымасць значна скараціць яе тэрміны і знізіць спадарожныя затраты.

### «АБ ЗМЯНЕННІ ЗАКОНАЎ ПА ПЫТАННЯХ ПЕНСІЁННАГА ЗАБЕСПЯЧЭННЯ»

Сёння ў Беларусі на змяненне заканадаўства ў сферы працы і занятасці насельніцтва апроч іншых існуюць два запыты. Першы — ад работадаўцаў, якія адчуваюць патрэбу ў работніках розных узростаў, другі — ад насельніцтва. Беларусы сталі даўжэй заставацца актыўнымі на рынку працы і імкнуцца весці звыклы актыўны лад жыцця, нягледзячы на ўзрост. Гэты факт адзначыла **міністр працы і сацыяльнай абароны Наталля ПАЎЛЮЧЭНКА**, прадставіўшы на разгляд законапраект, які карэкціруе пенсіённае заканадаўства.



Ініцыятыва накіравана на зняцце абмежаванняў для працуючых пенсіянераў, у першую чаргу дзяржаўных служачых. Раней дзяржслужачаму, які дасягнуў агульнага пенсіённага ўзросту, пенсія выплачвалася толькі пры поўным спыненні работы, нагадала Наталля Паўлючэнка. Прычым пакінуць трэба было не толькі службу ў дзяржорганах, але і любую іншую занятасць, з-за чаго многія яшчэ здольныя працаваць спецыялісты вымушаны былі рабіць выбар. Пасля ўнясення змяненняў выплата пенсіі за выслугу гадоў у сувязі з работай будзе прыпыняцца да дасягнення пенсіянерам агульнаўстаноўленага пенсіённага ўзросту, а пасля яго дасягнення — выплачвацца ў поўным аб'ёме незалежна ад факта работы.

### «АБ ЗМЯНЕННІ ЗАКОНАЎ ПА ПЫТАННЯХ ІНДЫВІДУАЛЬНАЙ ПРАДПРЫМАЛЬНІЦКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ»

У другім чытанні быў адобраны законапраект, які ўдакладняе прававое становішча індывідуальных прадпрымальнікаў. Да таго ж ён прыводзіць тэрміналогію ў адпаведнасць з нядаўнімі зменамі ў заканадаўстве, канкрэтызуе шэраг паняццяў, а таксама вызначае сферы дзейнасці, даступныя індывідуальным прадпрымальнікам і самазанятым. Прапанаваныя папраўкі павінны адрэгуляваць і парадак звароту прадпрымальнікаў у суды, а таксама іх узаемадзеянне з дзяржаўнымі органамі.

**Аміна НАЗАРАВА.**



Фота БелТА.

# АКЦЭНТ НА РАЗВІЦЦІ

## «Моцныя рэгіёны — гэта высокааплатныя працоўныя месцы і камфортныя ўмовы для жыцця»

**Пра гэта заявіла намеснік міністра эканомікі Марыя Мажынская ў інтэрв'ю праграме «Контуры» тэлеканала АНТ.**

Па словах намесніка кіраўніка эканамічнага ведамства, для развіцця рэгіёнаў, умацавання іх эканамічнага патэнцыялу важнай умовай з'яўляецца генерацыя і рэалізацыя новых інвестыцыйных праектаў.

— У цэлым за бягучую пяцігодку мы плануем завяршыць больш за тысячу праектаў, практычна ўсе яны рэалізоўваюцца за межамі сталіцы. Будзе створана звыш 13 тысяч новых працоўных месцаў. Вядома, гэта дасць значны імпульс развіццю рэгіёнаў, — выказала ўпэўненасць намеснік міністра.

Яна нагадала, што ў 2024-м уступіў у сілу новы Закон «Аб інвестыцыях», які дае прагрэсіўныя механізмы падтрымкі бізнесу:

— З дапамогай гэтага інструмента рэалізоўваюцца тры інвестыцыйныя дамовы на 2,6 мільярда рублёў і 24 прэферэнцыйныя інвестпраекты на агульную суму каля 1,4 мільярда рублёў.

Акрамя таго, дадала спікер, з падтрымкай дзяржавы ствараюцца вытворчыя пляцоўкі, дзе інвестары могуць аператыўна распачаць рэалізацыю сваіх праектаў.

— Першая такая пляцоўка ўжо дзейнічае ў Баранавічах. У найбліжэйшы час адбудзецца адкрыццё першага корпуса індустрыяльнага парка ў Пінску. Практыку развіцця вытворчай інфраструктуры ў нашых рэгіёнах мы маем



намер працягваць і ў далейшым, — распавяла Марыя Мажынская.

Як адзначыла намеснік міністра эканомікі, не менш важны прыярытэт — сацыяльная інфраструктура.

За чатыры гады ўведзена ў эксплуатацыю 55 дзіцячых садкоў, 66 школ, адрамантавана 75 раённых бальніц. Пабудавана 21,7 мільёна «квадратаў» жылля, яшчэ 13 мільёнаў квадратных метраў адрамантавана, рэканструявана больш за 13 тысяч кіламетраў дарог.

— Высокія тэмпы захаваем і ў новай пяцігодцы. Агульны тэмп інвестыцый запланаваны на ўзроўні 116,7 %. Сфарміраваны пул з 700 інвестпраектаў на суму больш за 35 мільярдаў рублёў. Каля 250 сацыяльных аб'ектаў будзе ўведзена альбо рэканструявана.

На думку Марыі Мажынскай, усё гэта дазволіць знізіць міжрэгіянальную дыферэнцыяцыю, стварыць роўныя магчымасці ў пытаннях занятасці і якасці жыцця ў кожным рэгіёне.

# ВАЖКАЯ ПАДТРЫМКА

## Якім будзе бюджэт ФСАН на 2026 год?



**Днямі кіраўнік дзяржавы падпісаў Закон аб бюджэце ФСАН на наступны год. У Мінпрацы і сацабароны растлумачылі, якім ён будзе.**

У прыватнасці, даходы бюджэту фонду плануюцца на ўзроўні 39 мільярдаў рублёў, што на 3,8 мільярда рублёў больш чаканага выканання 2025 года. Тэмп росту — амаль 111 %.

Асноўнай крыніцай даходаў з'яўляюцца ўзносы на дзяржаўнае сацыяльнае страхаванне, якія складуць 36,1 мільярда рублёў.

Расходная частка бюджэту фонду запланавана ў суме 38,5 мільярда рублёў, што на 5,7 мільярда рублёў, або на 17,3 %, больш у параўнанні з 2025 годам.

Куды пойдуць сродкі?

Асноўную частку бюджэту фонду ў 2026 годзе плануецца накіраваць на фінансаванне пенсій — 31,1 мільярда рублёў.

Дарэчы, у 2026 годзе сярэдні памер пенсіі па ўзросце для непрацоўных пенсіянераў працягне рост і павялічыцца на 14,5 %, што складзе каля 1,1 тысячы рублёў.

Значныя сродкі таксама будуць накіраваны на выплату дапамог, у першую чаргу сямейных. Агульны аб'ём выдаткаў на гэтыя мэты складзе амаль 7 мільярдаў рублёў, з якіх 3,7 мільярда рублёў пойдзе на падтрымку сем'яў з дзецьмі.

— У цэлым бюджэт Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва на 2026 год сфарміраваны з перавышэннем даходаў над выдаткамі за кошт сродкаў прафесійнага пенсійнага страхавання ў суме 519 мільёнаў рублёў, — пракаментавалі ў Мінпрацы і сацабароны.

### У тэму

У 2026 годзе заработная плата работнікаў бюджэтных арганізацый вырасце больш чым на 14 %.

Дарэчы, мінімальная заработная плата з новага года таксама павысіцца — з 1 студзеня яе памер складзе 858 рублёў.

— З улікам прынятых мер намінальная налічаная заработная плата работнікаў бюджэтных арганізацый за студзень — кастрычнік 2025 года павялічылася на 18,8 % і склала 2023 рублі. Рэальная заработная плата ўзрасла з тэмпам 111,4 %. Пры гэтым тэмпы росту заработнай платы работнікаў бюджэтных арганізацый перавышаюць рост заработнай платы работнікаў па эканоміцы ў цэлым амаль на 2 %, — адзначыла намеснік начальніка ўпраўлення аплаты працы ў бюджэтнай сферы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Таццяна Лук'янчыкава.

# АГУЛЬНЫ ІНФЛЯЦЫЙНЫ ЦІСК СЛАБЕЕ

## ЕАБР – аб спажывецкіх цэнах

**Да такой высновы прыйшлі аналітыкі Еўразійскага банка развіцця ў сваім штотыднёвым макраэканамічным аглядзе.**

— Інфляцыя ў Беларусі склала 7 % год да года ў лістападзе 2025-га пасля 6,9 % у кастрычніку, — гаворыцца ў аглядзе.

У прыватнасці, харчовая інфляцыя дасягнула 9,9 % год да года ў лістападзе пасля 9,8 % месяцам раней на фоне падаражэння сезонных агароднiны і садавіны на 12,7 % у гадавым выражэнні (10,1 % у кастрычніку). Цэны на нехарчовыя тавары выраслі на 2,6 % год да года (2,5 % у кастрычніку), на паслугі — на 7,7 % (7,6 % у кастрычніку). Базавая інфляцыя знізілася да 7 % у гадавым выражэнні пасля 7,1 % у кастрычніку.

— Зніжэнне ўстойлівага кампанента інфляцыі, якое працягваецца чацвёрты месяц запар, паказвае на паслабленне агульнага інфляцыйнага ціску, — звярнулі ўвагу аналітыкі ЕАБР.

# АБ'ЁМ ЗДЗЕЛАК РАСЦЕ

## БУТБ і Цэнтр падтрымкі экспарту Уладзімірскай вобласці будуць узаемадзейнічаць па лініі біржавога гандлю

**Такая дамоўленасць была дасягнута ў ходзе візіту прадстаўніка БУТБ у Суздаль і ўдзелу ў VI Уладзімірскім інвестыцыйным кангрэсе, дзе прайшлі перагаворы з лакальнымі вытворцамі і кампаніямі з Азербайджана, В'етнама, Індыі і Казахстана, паведамілі на біржы.**

Тут растлумачылі, што бакі плануюць сумесна далучаць у біржавы гандаль прадпрыемствы рэгіёна, кансультаваць па пытаннях ажыццяўлення гандлёва-закупачнай дзейнасці на пляцоўцы БУТБ.

Па словах дырэктара ЦПЭ Дар'і Грачухінай, Беларусь — адзін з ключавых гандлёва-эканамічных партнёраў рэгіёна. Таму чакаецца, што ўзаемадзеянне з БУТБ дасць больш шырокія магчымасці па рэалізацыі і закупцы прадукцыі ў Беларусі.

Дарэчы, на БУТБ акрэдытаваны 37 кампаній і індывідуальных прадпрымальнікаў з Уладзімірскай вобласці. У студзені — лістападзе 2025-га аб'ём біржавых здзелак кампаній рэгіёна дасягнуў 2,2 мільёна долараў (за такі ж перыяд 2024 года — усяго 0,3 мільёна долараў).


БЕЛАРУСБАНК

Уважаемые клиенты!

Для повышения надежности и качества услуг

Беларусбанк проводит масштабное обновление программного обеспечения

Основные работы будут проводиться в период с 24 декабря до 15:00 29 декабря 2025 года.

В указанный период обслуживание будет осуществляться в соответствии с сокращенным перечнем операций. Операции по вкладным и текущим счетам (открытие, закрытие, пополнение, снятие, зачисление, списание средств и другие) в отделениях, мобильном приложении M-Belarusbank, системе Интернет-банкинг, в банкоматах и инфокиосках банка и подразделениях РУП «Белпочта», а также посредством ПС ЕРИП будут недоступны.

При необходимости возврата срочного банковского вклада (в том числе, открытого в дистанционных каналах банка), истекающего в период с 25 декабря по 28 декабря 2025 (включительно), просим ознакомиться с текстом Публичной оферты (предложения) на установление временного порядка начисления процентов по срочным банковским вкладам физических лиц и обратиться в любое подразделение банка в период с 18 декабря до 17:30 24 декабря 2025 с документом, удостоверяющим личность.

Просим спланировать и заранее провести необходимые операции. Признательны за ваше понимание и доверие.

ПУБЛИЧНАЯ ОФЕРТА (предложение) на установление временного порядка начисления процентов по срочным банковским вкладам физических лиц

1. ОАО «АСБ Беларусбанк» (далее – Банк) предлагает внести изменения и дополнения в договоры срочных отзывных и безотзывных банковских вкладов, открытых как в подразделениях Банка, так и в каналах дистанционного банковского обслуживания (далее – срочные банковские вклады), открытых в Банке в части установления следующего порядка начисления процентов по срочным банковским вкладам физических лиц (далее – временный порядок).

В соответствии с временным порядком:

1.1. при совершении Вкладчиком в период с 18.12.2025 по 24.12.2025 (включительно) операций в подразделениях Банка по досрочному возврату денежных средств по договору срочного банковского вклада, срок возврата которого приходится на период с 25.12.2025 по 28.12.2025 (включительно), расчет процентов осуществлять за фактический срок хранения срочного банковского вклада без перерасчета процентов по пониженной процентной ставке, определенной договором банковского вклада.

Налогообложение доходов осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Досрочный возврат срочных безотзывных банковских вкладов осуществляется в любом подразделении Банка вне зависимости от места ведения счета без соблюдения процедуры принятия решения о досрочном возврате срочного безотзывного банковского вклада с оформлением заявления.

Досрочный возврат срочных отзывных банковских вкладов осуществляется в любом подразделении Банка вне зависимости от места ведения счета с оформлением заявления.

1.2. В случае если в период с 18.12.2025 по 24.12.2025 (включительно) по срочному банковскому вкладу со сроком возврата в период с 25.12.2025 по 28.12.2025 (включительно) со стороны Вкладчика в подразделение Банка не представлено заявление о досрочном его расторжении, срок возврата вклада переносится на 29.12.2025 с начислением процентов за фактический срок хранения вклада без перерасчета процентов по пониженной процентной ставке, определенной договором банковского вклада.

2. Условия, изложенные в пункте 1 настоящей публичной оферты (предложения), применяются в отношении вкладов, по которым в период их действия не начислялась пониженная процентная ставка в соответствии с условиями соответствующего договора срочного банковского вклада.

Условия, изложенные в подпункте 1.1 настоящей публичной оферты (предложения), не применяются в случае обращения Вкладчика в Банк в период, отличный от периода, указанного в подпункте 1.1 настоящей публичной оферты (предложения).

3. Моментом полного и безоговорочного принятия, то есть акцепта Вкладчиком настоящей публичной оферты (предложения) являются совершение Вкладчиком соответствующих действий, указанных в настоящей публичной оферте (предложении), заключающихся:

3.1. в обращении Вкладчика к Вкладополучателю в период с 18.12.2025 по 24.12.2025 (включительно) с заявлением о возврате срочного банковского вклада до истечения срока возврата по договору срочного банковского вклада со сроком возврата с 25.12.2025 по 28.12.2025 (включительно), а также получении Вкладчиком процентов по вкладу, начисленных в соответствии с подпунктом 1.1 настоящей публичной оферты (предложения);

3.2. в обращении Вкладчика к Вкладополучателю с 29.12.2025 с предложением по закрытию договора срочного банковского вклада со сроком возврата с 25.12.2025 по 28.12.2025 (включительно), а также получении Вкладчиком процентов по вкладу, начисленных в соответствии с подпунктом 1.2 настоящей публичной оферты (предложения).

Подробности по телефону 147, на корпоративном сайте belarusbank.by и в отделениях Беларусбанка

УНП 100325912




# АД ГІСТАРЫЧНЫХ АРХІВАЎ ДА ІНТЭРАКТЫЎНЫХ ПРАЕКТАЎ

## Прэзідэнцкая бібліятэка падрыхтавала шэраг выставак да УНС

Да Усебеларускага народнага сходу, які пройдзе на гэтым тыдні, Прэзідэнцкая бібліятэка Беларусі падрыхтавала не толькі адмысловыя экспазіцыі са сваіх архіваў, але і інтэрактыўныя лічбавыя праекты. Усе ахвотныя могуць у гэтыя дні пазнаёміцца як з гісторыяй развіцця выбарчых працэсаў і дэмакратычных інстытутаў у Беларусі на працягу апошніх стагоддзяў, так і з рэдкімі матэрыяламі, прысвечанымі найноўшай гісторыі нашай краіны і станаўлення суверэнітэту. Сярод іх, у прыватнасці, першае пасланне Прэзідэнта краіны народу і парламенту.




— Прэзідэнцкая бібліятэка заўсёды будзе ісці поруч з нашай дзяржавай, выхоўваць нашу моладзь ідэалагічна. Мы заўсёды былі сувязным флагманам і паказвалі пераемнасць пакаленняў, традыцыйныя беларускія каштоўнасці, — адзначыла **дырэктар Прэзідэнцкай бібліятэкі Беларусі Алена СЕКАЧ.**

У аддзеле рэдкага фонду на выстаўцы «Выбары: погляд праз час» сабраны ўнікальныя дакументы, якія дэманструюць, што гісторыя выбараў сыходзіць у старадаўнія часы, калі для вырашэння пытанняў гараджане збіраліся на так званае веча. А вось ужо Статут Вялікага Княства Літоўскага заканадаўча замацаваў работу дэпутатаў, якія выбіраліся на земскія і агульныя сеймы.

У іншых залах экспазіцыя ад гісторыі пераходзіць да сучаснасці і прысвечана нядаўнім падзеям, пачынаючы ад ўвядзення пасады Прэзідэнта ў Канстытуцыю 1994 года, і завяршаючы паспяховым функцыянаваннем Усебеларускага народнага сходу, як эфектыўнага органа народаўладдзя ў новым канстытуцыйным статусе. Асаблівае месца займае ўступная прамова кіраўніка дзяржавы на першай інаўгурацыі, у якой ён падкрэсліў, што галоўным багаццем Беларусі з'яўляецца народ, а асноўная задача ўсіх органаў дзяржаўнай улады, у тым ліку і Прэзідэнта, — забяспечыць людзям дастойнае жыццё.

— Мы разумеем, што гэта не проста словы, бо на сёння наша краіна прайшла чатыры рэспубліканскія рэферэндумы і сем Усебеларускіх народных сходаў. Цяпер мы знаходзімся напярэдадні такой важнай падзеі, як другое пасяджэнне VII Усебеларускага народнага сходу, і, вядома, ключавой падзеяй стане чарговае пасланне Прэзідэнта беларускаму народу і парламенту. Ва ўсіх наведвальнікаў ёсць унікальная магчымасць пазнаёміцца з самым першым пасланнем Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі парламенту ў 1997 годзе, — акцэнтавала **загадчык сектарам аддзела абслугоўвання карыстальнікаў Лілія ЕФІМОВІЧ**, нагадаўшы, што гэта час, калі завяршыўся перыяд палітычнай нестабільнасці, завяршылася канстытуцыйная рэформа пасля рэферэндуму 1996 года і пачаў працаваць двухпалатны парламент. — Асноўны яго тэзіс — «Мы ўсе ў адказе за нашу Беларусь». Прэзідэнт зноў падкрэсліў, што будучыня нашай краіны залежыць ад кожнага яе жыхара. У пасланні акцэнт зроблены на тым, што не народ для ўлады, а ўлада для народа. Такая дзяржаўная палітыка рэалізуецца ў нашай краіне, у чым сапраўды сёння мы можам пераканацца, — падзялілася суразмоўца.

А вось маладыя спецыялісты бібліятэкі, а іх, дарэчы, ва ўстанову сёлета прыйшло пяцёра, падрыхтавалі прэзентацыю падборкі артыкулаў СМІ, прысвечаных УНС. У стагоддзе лічбавых тэхналогій гэта зручна для маладога пакалення, якое аддае перавагу электронным СМІ. Яна размешчана на ўсіх экранах бібліятэкі і ва ўсіх аддзелах абслугоўвання.

Яшчэ адна выстаўка бібліятэкі — «Усебеларускі народны сход — гарызонты народнага форуму». Тут у храналагічным парадку паказана гісторыя развіцця УНС. З дапамогай кніг, перыядычных выданняў, а таксама інфармацыйнага матэрыялу наведвальніку расказваюць пра форум як пра праяву айчыннай традыцыі народаўладдзя, якая мае багатую гісторыю. Тут, напрыклад, кожны можа ўзгадаць, што першы Усебеларускі сход праходзіў у сталічным Палацы спорту 19-20 кастрычніка 1996 года і стаў самым масавым.

Аднак сённяшняя бібліятэка — гэта не толькі кнігі. Установа прэзентавала новы інтэрактыўны праект «Агучаная Канстытуцыя». Вывучэнне асноўнага закона краіны праходзіць у жывым дыялогу разам з анлайн-кансультантам. Ён разлічаны як на школьнікаў і студэнтаў ВНУ, так і на дарослых. Інфармацыйны кантэнт прадставіла Прэзідэнцкая бібліятэка. Ён аб'ядноўвае нейрамоўную апрацоўку, сінтаксіс мовы, візуалізацыю. Складаныя тэрміны прававой тэматыкі тлумачацца даступнай і простай мовай, пры гэтым у дастатковым аб'ёме.

— Гэты праект паказвае, што Прэзідэнцкая бібліятэка ідзе ў нагу з часам. Місія бібліятэкі сёння — гэта не толькі кніжныя выстаўкі. Мы адукоўваем, навучаем, нясём інфармацыю. І дапоўненая рэальнасць, новыя інфармацыйныя тэхналогіі, якія ўвайшлі ў наша жыццё, дапамагаюць нам. Мы па-ранейшаму павінны паказаць падрастаючаму пакаленню цікавасць да кнігі, адукацыі, а з дапамогай штучнага інтэлекту, новых тэхналогій спадзяёмся, што нам удасца прыцягнуць у бібліятэку больш моладзі, — рэзюмавала Алена Секач.

**Алена КРАВЕЦ, фота аўтара.**

# ПРОСТЫМІ СЛОВАМІ — АБ ВАЖНЫМ

## Як у мінскай школе № 139 вучням даступна расказваюць аб дзейнасці УНС

Лічаныя дні застаюцца да другога пасяджэння VII Усебеларускага народнага сходу. Мы добра ведаем, што рашэнні, прынятыя 18–19 снежня, закрануць жыццё кожнага беларуса: і дарослага, і малога. І калі з першымі працей, то як растлумачыць дзіцяці, што такое УНС, хто можа трапіць у лік дэлегатаў, якія задачы выконвае вышэйшы прадстаўнічы орган народаўладдзя? Адказ на гэта пытанне ведаюць у сталічнай сярэдняй школе № 139, дзе напярэдадні праводзяцца тэматычныя практыкумы для настаўнікаў, алімпіяды для вучняў, ствараюцца інфармацыйныя буклеты для бацькоў і не толькі.

— Інфармаваць дзяцей аб дзейнасці Усебеларускага народнага сходу мы з калегамі сталі загадзя, — расказала **дырэктар сярэдняй школы № 139 г. Мінска Наталля ДУБОВАЯ**. — І не толькі, дарэчы, нашых вучняў, але і маладых педагогаў, якіх у нашай установе адукацыі працуе нямала. Яны тут праходзяць станаўленне не толькі як спецыялісты, але і як асобы, для гарманічнага развіцця якой важна добра арыентавацца ў тым, што адбываецца навокал. А УНС і рашэнні, якія будуць на ім прынятыя, не абыдуць бокам кожнага. Акрамя таго, мы актыўна працуем і з законнымі прадстаўнікамі нашых вучняў. Пры дапамозе розных форм работы стараемся ахапіць як мага больш людзей. Настаўнікі — праваднікі дзяцей і моладзі ў свет. Для нас важна данесці праўду, каб яны з адкрытым сэрцам і цвёрдым розумам потым працягвалі ствараць гісторыю сваёй краіны.

Пытанні дзяржаўнага ладу вывучаюцца ў старшай школе, таму для падрастаючага пакалення інфармацыя аб дзейнасці УНС вядомая. Пра гэта нам расказала **класны кіраўнік 11 класа, настаўнік гісторыі і грамадазнаўства Таццяна ГЕРЦБЕРГ**, якая з'яўляецца адным з арганізатараў школьных мерапрыемстваў, што датычацца дзейнасці УНС.

— Было вырашана з усімі дзецьмі праводзіць інфармацыйную работу, нават з самымі маленькімі. У пачатковай школе рабілі ўпор на візуальны складнік: паказвалі карцінкі, рабілі схемы, разважалі аб складаным простай мовай. Арганізавалі для іх конкурс малюнкаў, найлепшыя з якіх размясціліся ў школьнай галерэі на першым паверсе. Што датычыцца старшай школы, нам хочацца прывіваць падлеткам аналітычнае мысленне. Для гэтага важна даць ім права голасу. Меркаванне кожнага вучня для нас важна. Пачуць яго нам удавалася на інтэрактыўных уроках. Дзеці стваралі ўласныя праекты, дзяліліся, якія б яны ініцыятывы прапанавалі як дэлегаты Усебеларускага народнага сходу. Гаворка ішла аб добраўпарадкаванні, лічбавізацыі, экалагічных пытаннях. Асобна можна вылучыць алімпіяду для старшакласнікаў, якую мы правялі. Дзеці ішлі туды не проста паўдзельнічаць, а праверыць свае веды. Многія, дарэчы, адказвалі вельмі ўпэўнена.



Для **адзінаццацікласніцы Юліі КРАЎЦОВАЙ** заданні на алімпіядзе здаліся даволі простымі.

— Вынікі пакуль яшчэ невядомыя, але, калі ты напярэдадні рыхтаваўся, складанасцяў асабліва не ўзнікала. Мне здаецца, такія школьныя мерапрыемствы вельмі карысныя. Яны звяртаюць увагу на важныя для краіны падзеі, заклікаюць даведацца пра іх больш, пашырыць кругагляд. Усебеларускі народны сход закране і нас, моладзь, таму гэта важна.



На пытанне аб тым, якую б ініцыятыву прыўнесла дзяўчына, калі б была дэлегатам УНС, у Юліі не было сумненняў:

— Паколькі я хачу звязаць сваё жыццё з машынабудаваннем, мне найбольш блізкія пытанні прамысловасці. Як зрабіць так, каб гэта сфера з кожным годам развівалася яшчэ больш упэўнена.

**Адзінаццацікласніца Надзея ЖЫВІЦА** не выключае, што ў будучыні можа ўвайсці ў лік дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу. Дзяўчыне блізкая педагагічная сфера, таму ў якасці асабістай ініцыятывы яна б прапанавала распрацаваць сумесна са спецыялістамі дадатак для спрашчэння праверак дамашняга задання настаўнікам.

— Ідэя пакуль павярхоўная, але ж гэта рэальна прыдумаць. Улічваючы, як імкліва цяпер развіваецца штучны інтэлект. А з праверкай заданняў настаўнікі сутыкаюцца штодня.

Сама аб дзейнасці УНС больш падрабязна дзяўчына даведалася ад класнага кіраўніка на інфармацыйнай гадзіне.

— Потым падхапіла ініцыятыву, стала раздаваць бацькам вучняў буклеты аб дзейнасці УНС, якія распрацавалі нашы настаўнікі. Убачыла шчырую зацікаўленасць з боку дарослых, расказала пра УНС і сваім бацькам. Нам было што абмеркаваць!

**Яна ВАЛАСАЧ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**









БЕЛАРУСЬ БУДУЧЫНІ

# «АД НАШАЙ РАБОТЫ ЗАЛЕЖАЦЬ СТАБІЛЬНАСЦЬ ДЗЯРЖАВЫ І ДАБРАБЫТ ГРАМАДЗЯН»

## Дэлегаты УНС усведамляюць важнасць і адказнасць сваёй дзейнасці на Сходзе

Упершыню Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на наступную пяцігодку будзе зацвярджацца Усебеларускім народным сходам як найвышэйшым органам народаўладдзя. Дэлегаты УНС адчуваюць сваю адказнасць і рыхтуюцца да Сходу з настроем на канструктыўную работу.



**Дэлегат УНС, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях Палаты прадстаўнікоў Святлана СЯНЬКО:**

— Усебеларускі народны сход — не проста маштабны форум, а канстытуцыйны орган, які вызначае стратэгічны курс развіцця нашай краіны і адлюстроўвае волю народа. Таму, безумоўна, падрыхтоўка да УНС мае асаблівае значэнне. Фактычна гаворка ідзе пра падрыхтоўку да адказнага выбару, ад якога залежыць будучыня краіны. Мы падыходзім да гэтага этапу з улікам дасягнутых вынікаў і з асэнсаваннем задач, што стаяць перад дзяржавай і грамадствам. Менавіта таму цэнтральнае месца на Сходзе зойме праект Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2026—2030 гады. У аснову дакумента пакладзены прапановы экспертаў, меркаванні грамадзян і вынікі шырокага грамадскага абмеркавання.

Прынцыпова важна падкрэсліць, што ў цэнтры Праграмы знаходзіцца чалавек. Дзяржава захоўвае сваю сацыяльную накіраванасць і арыентуецца на павышэнне ўзроўню жыцця насельніцтва. Гаворка ідзе пра стварэнне годных умоў для працы, жыцця і самарэалізацыі людзей. Асаблівая ўвага надаецца дэмаграфічнай палітыцы, умацаванню інстытута сям'і, падтрымцы мацярынства і дзяцінства, захаванню здароўя нацыі.

Значнае месца ў Праграме займае развіццё рэгіёнаў. Гэта і адкрыццё новых вытворчасцей, стварэнне працоўных месцаў, развіццё сучаснай інфраструктуры, павышэнне эфектыўнасці эканомікі. Такія меры даюць людзям упэўненасць у заўтрашнім дні і магчымасць будаваць сваё жыццё на роднай зямлі. У гэтым жа шэрагу знаходзіцца і развіццё турызму як перспектыўнага кірунку, які спрыяе эканамічнаму росту і фарміраванню цікавасці да гісторыі і культуры краіны.

На дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу сёння ўскладзена асаблівая адказнасць. Нам належыць прымаць рашэнні, якія вызначаць развіццё Беларусі на бліжэйшыя гады. Ад нашай пазіцыі і нашай работы залежаць стабільнасць дзяржавы і дабрабыт грамадзян. Перакананa, што Усебеларускі народны сход стане пляцоўкай для ўзважаных і прадуманых рашэнняў, накіраваных на ўмацаванне суверэнітэту і сацыяльнай справядлівасці.



**Дэлегат УНС, старшыня Іўеўскага раённага выканаўчага камітэта Ігар ГЕНЕЦ:**

— Чаканні ад УНС вельмі вялікія, бо на Сходзе будзе прынята Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2026 — 2030 гады. Гэта фундаментальны дакумент, і ўсё, што там прапісана, прадугледжвае дакладнае выкананне. Прэм'ер-міністр штогод будзе даваць справаздачу перад дэлегатамі УНС аб выкананні Праграмы. Якія змяненні чакаюць Іўеўскі раён? Праграмай сацэканамразвіцця запланавана будаўніцтва ў райцэнтры фізкультурна-аздараўленчага комплекса, які жыхары раёна чакаюць ужо некалькі дзесяцігоддзяў. Для нашых людзей гэта вельмі важны і патрэбны аб'ект. Напярэдадні пасяджэння УНС праводзім сустрэчы з насельніцтвам, гаворым аб тым, якія важныя рашэнні будуць прыняты на Сходзе. Актыўна абмяркоўваем Праграму сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на будучую пяцігодку. Людзей гэта вельмі цікавіць.

Упершыню дэлегаты Усебеларускага народнага сходу будуць прымаць рашэнне аб прызначэнні суддзяў Канстытуцыйнага і Вярхоўнага судоў. Справядлівасць — брэнд нашай краіны. Апошняй інстанцыяй справядлівасці, як вядома, з'яўляюцца суды. Таму суддзі, чые кандыдатуры будуць падтрыманы дэлегатамі, надзелены не толькі ўладай, але і даверам народа (дэлегаты УНС, нагадаю, — выбраннікі народа). Таму суддзі будуць несці адказнасць не толькі перад законам, але і перад тымі людзьмі, якія іх выбралі.



**Дэлегат УНС, начальнік Вілейскага вытворчага ўчастка Мінскага малочнага завода № 1 Анастасія СЯЛЮН:**

— Асноўнай мэтай Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2026—2030 гады з'яўляецца паляпшэнне якасці жыцця кожнага беларуса. Як прадстаўніка прамысловага прадпрыемства мяне вельмі радуе, што аднымі з ключавых кірункаў праграмы з'яўляецца выкарыстанне інавацыйных тэхналогій, мадэрнізацыя вытворчасці, рост канкурэнтаздольнасці. Гэта дае ўпэўненасць, што мы зможам вырабляць яшчэ больш якасную і запатрабаваную прадукцыю. Быць дэлегатам Усебеларускага народнага сходу — вялікая адказнасць. Мы ўцягнуты ў лёсавызначальныя для нашай краіны працэсы.



**Дэлегат УНС, дырэктар Белаазёрскага завода бетонных вырабаў Ганна ВОДЗІЧ:**

— На сёння УНС у новай канстытуцыйнай якасці можна разглядаць як гарант стабільнасці і стратэгічнага развіцця Беларусі. Усебеларускі народны сход — пацвярджэнне таго, што дзяржаўная ўлада пад лозунгам «Мы — разам» дзейнічае ў інтарэсах народа, яе рашэнні скіраваны на ўмацаванне ўсіх галін эканомікі і незалежнасці нашай краіны. Праект Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на бліжэйшыя пяць гадоў сёння абмяркоўвае ўся краіна, ён адлюстроўвае рэальныя патрэбы беларусаў, не замоўчваюцца ў ім і праблемныя пытанні. Кожнаму блізкія і зразумелыя прыярытэтныя кірункі праграмы. Планы на бліжэйшыя пяць гадоў служаць мэце пабудовы канкурэнтаздольнай дзяржавы, у цэнтры якой — інтарэсы чалавека, годны ўзровень жыцця для кожнага насельніка Беларусі. Праграма рэалістычная, канкрэтная і падрабязная. Яна будзе выканана пры ўмове ўсеагульнай зацікаўленасці. Час выбраў нас. Кожны беларус вызначыць для сябе, які ўнёсак ён можа зрабіць у развіццё нашай краіны.

Старшыня Брэсцкага аблвыканкама Пётр Пархомчык назваў галоўную задачу для Першага рэгіёна: «Кожны куточак вобласці павінен быць тэрыторыяй магчымасцяў — для працы, самарэалізацыі і развіцця. Гэты падыход будзе асноўны для ўключэння інтарэсаў Брэстчыны ў агульнадзяржаўную праграму. Вызначаны асноўныя вектары развіцця на бліжэйшую пяцігодку, сярод іх — стварэнне новых прадпрыемстваў і вытворчасцяў, развіццё транспартнай лагістыкі і камунальнай інфраструктуры, умацаванне аграпрамысловага комплексу, актыўная падтрымка малога і сярэдняга бізнесу, а таксама інавацыйныя праекты для стымулявання прадпрымальніцкай ініцыятывы. Ажыццяўленне вызначаных планаў сфарміруе моцны падмурак для эканамічнай устойлівасці і сацыяльнай стабільнасці як у нашым рэгіёне, так і па ўсёй краіне. Як дэлегат УНС, адчуваю адказнасць перад выбаршчыкамі. Мая задача не толькі ў прадстаўленні інтарэсаў, але і перадачы грамадству стратэгічных рашэнняў, праграмных дакументаў, што будуць выпрацаваны ў працэсе работы УНС.



**Дэлегат УНС, настаўнік біялогіі і геаграфіі Бачэйкаўскай СШ імя М. А. Высагорца Бешанковіцкага раёна Віктар ПРОТАС:**

— Маючае адбыцца пасяджэнне Усебеларускага народнага сходу — ключавая падзея ў палітычным жыцці нашай дзяржавы. Гэта форум, дзе прымаюцца рашэнні, якія ўплываюць на жыццё кожнага беларуса.

На Сходзе будзе вызначана стратэгія развіцця нашага грамадства, прыняты дакладныя шляхі вырашэння праблемных пытанняў.

Перад дэлегатамі УНС стаіць задача зацвярджэння Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2026—2030 гады. Сярод яе прыярытэтаў на першае месца ставіцца дэмаграфічная бяспека — павышэнне нараджальнасці і ўмацаванне здароўя нацыі.

Упэўнены, што прынятыя дэлегатамі УНС рашэнні ўмацуюць мір і стабільнасць у нашай дзяржаве, зробяць наша грамадства мацнейшым да выклікаў сучаснага свету.

**Паводле нашых карэспандэнтаў.**

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Лидахлебопродукт», Гродненская область, г. Лида, ул. Булата, 1. УНП 500022448. Тел. (0154) 65 25 01 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638, **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

**Здание административное** (инв. № 420/С-47480, **727,2 кв. м,** составные части: подвал, проходная) **и туи западные** (2 шт.). Адрес: **Гродненская обл., Лидский р-н, г. Лида, ул. Докучаева, 28.** ***Сведения о земельном участке:*** пл. 0,1288 га, предоставлен на праве аренды до 23.12.2074 для строительства и обслуживания администр. здания

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 1 465 962,363 бел. руб.** (снижена на 10 %)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 15 рабочих дней** после электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** оплата должна быть произведена в течение **60 (шестидесяти) календарных дней** с даты государственной регистрации договора купли-продажи. Переход права собственности и передача объекта недвижимости осуществляется после полной оплаты. Расходы, связанные с государственной регистрацией сделки, несет покупатель

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение в размере 2 % от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения торгов

Предыдущая публикация извещения в газете «Звязда» 08.10.2025

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 08.01.2026** с 11.00 до 12.00. Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **06.01.2026** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги»

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор аукциона)
извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего
**ОАО «Несвижский райагросервис»**
(Продавец)

**Аукцион состоится 21.01.2026 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.**

**Лот № 1 в составе:**

1. **Здание мастерской с инв. № 621/С-21081, 1682,6 кв. м.** Земельный участок 624255700001001353 (0,9752 га). Право постоянного пользования.
2. **Здание гаража с инв. № 621/С-21086, 492,9 кв. м.** Земельный участок 624255700001001350 (0,6034 га). Право постоянного пользования.
3. **Здание склада с инв. № 621/С-21083, 465,7 кв. м.** Земельный участок 624255700001001351 (0,2037 га). Право постоянного пользования.
4. **Здание конторы с инв. № 621/С-21084, 691,7 кв. м.** Земельный участок 624255700001001352 (0,3879 га). Право постоянного пользования.

Переход права на земельные участки осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.
Адрес: Минская обл., Несвижский р-н, г.п. Городея, ул. Интернациональная, 8.

Начальная цена с НДС 20 % – 518 640,00 руб.
Задаток – 50 000,00 руб. Шаг аукциона – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, определения лица, выигравшего аукцион, а также условия аукциона содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by).

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений и задатка – **19.01.2026 в 11.00.**

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

Оригинал свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя КРИВОНОСОВОЙ Янины Олеговны № 791025869, выданный 22.01.2016 администрацией Октябрьского района г. Могилева, утерян, в связи с чем утратил силу и **считается недействительным**

Вітражы майстэрства

# ПРАФЕСІЮ — У ЗАЛАТЫЯ РУКІ



## МАЙСТЭРСТВА ПРАЦАВАЦЬ З ДРЭВАМ

Асаблівую ўвагу надаюць навучанню дрэваапрацоўцы. Менавіта тэхналагічны каледж сярод усіх устаноў вобласці выпускае найбольшую колькасць профільных спецыялістаў: станочнікаў дрэваапрацоўчых станкоў, рамшчыкаў і сталяроў. У краіне 17 аналагічных каледжаў, і толькі на базе Віцебскага тэхналагічнага і Кобрынскага політэхнічнага каледжаў створаны цэнтры кампетэнцый тэхналогій дрэваапрацоўкі. Таму яны выконваюць ролю своеасаблівых апорных навучальных устаноў у сваіх рэгіёнах. Так, навучальна-практычнай базай мясцовы каледж з'яўляецца для сямі ССНУ і дзвюх ВНУ: БДТУ і ПДУ імя Ефрасінні Полацкай.



— Наш цэнтр кампетэнцый адкрыты напрыканцы 2020 года, — распавядае **дырэктар каледжа Валянціна ЮПАТАВА.** — Хаця ён добра абсталяваны, задумваемся аб абнаўленнях, набыцці новых, сучасных станкоў з пашыранымі функцыямі. Акрамя таго, што цэнтр выконвае ролю базы для павышэння кваліфікацыі работнікаў, занятых на прадпрыемствах вобласці, найперш — гэта майстэрні для навучэнцаў, дзе яны вучацца працаваць рукамі.

У цэнтр кампетэнцый яны прыходзяць, калі вучацца яшчэ на першым курсе. І не толькі падчас заняткаў: ёсць тыя, хто ўлюбляецца ў работу з дрэвам настолькі, што гатовы праводзіць тут увесь вольны час. З такіх і вылучаюцца будучыя ўдзельнікі Рэспубліканскага конкурсу прафесійнага майстэрства ProfSkills Belarus.

З года ў год віцябчане дэманструюць там годныя ўменні і заваёўваюць узнагароды. Сёлета ў маі Андрэй Цярэшкін заняў 2-е месца па кампетэнцыі «Цяслярная справа», Станіслаў Місюра стаў пераможцам конкурсу, а таксама ў Адкрытым чэмпіянаце краін-партнёраў ЕАЭС + у сталярнай справе. Аляксей Лубаў вылучыўся на гэтых спаборніцтвах па кампетэнцыі «Вытворчасць мэблі». На яго ж рахунку перамога ў чэмпіянаце па прафмайстэрству «Прафесіяналы», што праходзіў у Пскове.

— Аляксей па-сапраўднаму захоплены работай з дрэвам і з ахвотай робіць мэблю, нават у дзедавым гаражы абсталяваў сабе майстэрню, — паведаміла Валянціна Юпатава. — З такімі хлопцамі шкада развітвацца. Здаецца, толькі ўсяму навучылі, а яны ўжо паляцелі ў свет. А мы гордыя, што далі прафесію ў залатыя рукі. Сустракаем новых, на шчасце, іх паток не змяншаецца.

## ПАЧУЦЬ «ДУШУ» МАТЭРЫЯЛУ

Вялікае значэнне мае асоба настаўніка, і майстрам вытворчага навучання ўдаецца выклікаць непадробную цікаўнасць вучняў да справы, якую самі так любяць.

— Заходзячы ў майстэрню, я ўжо па паху магу вызначыць, з якім дрэвам толькі што працавалі, — усміхаецца майстар, галоўны эксперт па кампетэнцыі «Сталярная справа» Максім Сівакоў. — Дрэва — жывы матэрыял, і «пачуць» яго душу дадзена не кожнаму, але праз упартасць і нястомную прагу да самаўдасканалення можна дабіцца многага, варта толькі захацець.

Падобна на тое, што блізняты Дзяніс і Кірыл Паражынскія такім жаданнем гараць: яны яшчэ першакурснікі, але пад кіраўніцтвам Максіма Сівакова змайстравалі моцныя табурэты. Такія праслужаць доўга.

Дрэваапрацоўка — справа не толькі мужчынская. Доказ таму — прыклад майстра Кацярыны Івановай. Яна выпускніца каледжа, дзе цяпер працуе. Яе стыхія — выраб сувеніраў і дэкаратыўных элементаў на лазерным станку з лічбавым праграмным кіраваннем. Дзяўчына таксама рыхтуе канкурсантаў па кампетэнцыі «Вытворчасць мэблі».

## ЗАХАВАЛЬНІКІ НАРОДНЫХ ТРАДЫЦЫЙ

Прадукцыю, зробленую рукамі майстроў і навучэнцаў, рэалізуюць праз свой салон-магазін. А тут усяго багата! Таму што ў каледжы рыхтуюць рэзчыкаў па дрэве і бяросце, вытворцаў вырабаў з лазы, саломы, керамікі. А яшчэ Віцебскі тэхналагічны каледж — адзіная ў Беларусі ССНУ, якая вучыць на ювеліраў і ткачоў ручнога ткацтва.

Навучэнцаў аддзялення «Мастацтва і дызайн» можна смела назваць захавальнікамі народных традыцый. Атрымаўшы дыпломы, яны працаўладкоўваюцца ва ўстановы культуры, дзе прапагандуюць традыцыйныя рамёствы сваёй краіны і спрадвечнае ўменне стварыць прыгажосць ручной працай. Аўтэнтычныя матывы яны ўдала спалучаюць з сучаснымі прыёмамі — атрымліваецца самабытна. А калі прыходзяць пасля ВНУ на вытворчасць, добра разумеюць уласцівасці матэрыялаў, з якімі даводзіцца працаваць, валодаюць пэўнымі тэхнікамі.

— У апошнія гады конкурс на паступленне ў наш каледж на ўсе спецыяльнасці складае не менш як 1,5 чалавека на месца. Залічэнне праводзіцца на падставе дакументаў аб адукацыі, на аддзяленне «Мастацтва і дызайн» дадаткова здаецца творчы экзамен. Агульная колькасць паступіўшых складае 457 чалавек, — працягвае дырэктар. — Падчас вучобы выкладчыкі не шкадуюць высокіх адзнак, гэта матывуе рабят вучыцца лепей. У нас высокі працэнт дыпломаў з адзнакай, што дае іх уладальнікам перавагі пры паступленні ў ВНУ. Пераможцы конкурсаў прафмайстэрства залічаюцца ва ўніверсітэты без экзаменаў.

## ЗА СПЕЦЫЯЛІСТАМІ — ЧАРГА РАБОТАДАЎЦАЎ

Маладыя спецыялісты нарасхват у работадаўцаў, іншы раз на аднаго выпускніка профілю лясной гаспадаркі і дрэваапрацоўкі прэтэндуюць да 10 арганізацый. Высноўа: з дыпломам Віцебскага тэхналагічнага каледжа без работы не застанешся. Да прыкладу, выпускнікоў аддзялення дакументазнаўства і правазнаўства, 90 % якіх, як правіла, паступаюць на завочнае аддзяленне юрыдычнага факультэта ВДУ імя П. М. Машэрава, ахвотна прымаюць на работу сакратарамі суды, натарыяльныя канторы, следчы камітэт, пракуратура.

Да несумненных пераваг каледжа можна аднесці наяўнасць інтэрнатаў на 500 месцаў. Акрамя іх, вучэбных карпусоў, цэнтра кампетэнцый, сталовай, спартыўнай пляцоўкі, студэнцкі гарадок уключае басейн. У вольны час маладыя людзі могуць развівацца па інтарэсах у творчых гуртках і спартыўных секцыях, нават неаднаразова дэманстравалі свае поспехі ў конкурсах і на спаборніцтвах.

— Мы выхоўваем не лайдакоў, не беларучак, а грамадзян сваёй краіны, якія працай будуць рабіць яе багацейшай і прыгажэйшай, — заключае Валянціна Юпатава. — На прастору жыцця яны выходзяць з перакананнем, што толькі праца — залог дабрабыту. Мы адна з самых маладых ССНУ вобласці, нам усяго 42 гады. Але былыя выпускнікі ўжо прыводзяць паступаць да нас сваіх дзяцей. Гэта вялікі давер і пацвярджэнне: мы даём запатрабаваныя прафесіі і спецыяльнасці.



**Святлана ЯКАЎЛЕВА,**
**фота аўтара.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# ЯК ДОБРА ЎМЕЦЬ ЧЫТАЦЬ

## Вобразнае мысленне з'яўляецца ключавым фактарам канкурэнтаздольнасці чалавека перад электроннымі сістэмамі



**Электроннае мысленне ступіла далёка наперад і па шэрагу функцый ужо пакінула далёка чалавечыя магчымасці. Напрыклад, па хуткасці мы ўжо даўно не можам спаборнічаць з электроннымі сістэмамі. І прайгралі не ўчора: яшчэ лямпавыя сістэмы давалі нам фору па гэтым параметры. Складана спаборнічаць з гаджэтамі па аб'ёме запамінальнай інфармацыі. Але ў чалавека застаюцца велізарныя перавагі перад самымі наварочанымі лічбавымі сістэмамі. Мы выйграем канкурэнцыю ў электроннага мозгу ў частцы творчасці, інтуіцыі, уяўлення і вобразнага мыслення. Іншае пытанне, што гэтыя навыкі падвяргаюцца нападу сучасных камунікацыйных рашэнняў, многія з якіх грунтуюцца на выкарыстанні аўдыёвізуальнага кантэнту. Ён прывабней, але зніжае наша ўяўленне.**

Тэхналогіі заўсёды з'яўляюцца выклікам і прымушаюць нас змяняць свой лад жыцця. Фізкультура і спорт сталі масавым захапленнем пасля глыбокага пранікнення ў масы аўтатранспарту і механізаванай прамысловасці. Паўстагоддзя таму, не кажучы пра больш даўнія часы, фізічная праца прысутнічала практычна ўсюды. У адных галінах яна была лягчэй, у іншых — больш цяжкай, месцамі нават знясільваючай. Той жа кіроўца адчуваў вельмі істотныя фізічныя нагрузкі, калі даводзілася круціць руль грузавіка без гідраўзмацняльніка. У тыя часы людзям калі і патрабавалася трэніроўка, то выключна каб прывесці мышцы ў дастатковую кандыцыю для выканання тых ці іншых функцый.



Сёння жорсткая фізічная праца сыходзіць у мінулае. Аўтаматычныя станкі, сістэмы, пагрузчыкі, шматлікія прыстасаванні з разраду так званай малой механізацыі значна зніжаюць нагрузку — і на вытворчасці, і ў побыце. Сабраць, скажам, шафу звычайнай адвёрткай — ня дрэнная трэніроўка для шырокай групы цягліц. Але калі ёсць шурупавёрт, то задзейнічаны выключна адзін палец, астатнюю нагрузку бярэ на сябе інструмент. І каб падтрымліваць арганізм у тонусе, ужо даводзіцца прыдумляць фізічныя практыкаванні. Фітнес актыўна ўваходзіць у моду не толькі з-за імкнення да здаровага ладу жыцця, але і па прычыне змены тэхналагічных укладаў. На прабежкі і сілавыя трэнажоры застаюцца фізічныя сілы. Многія глыбока індустрыяльныя прафесіі перайшлі ў разрад разумовай працы з укараненнем станкоў з ЧПУ, рабатызаваных сістэм, аўтаматызаваных ліній вытворчасці. Молат і кувалда сышлі ў далёкае мінулае, сталявар ужо не стаіць побач з плавільнай печчу, а рэгулюе ўсе працэсы праз пульт кіравання, седзячы ў зручным крэсле.

Электронныя рашэнні, у тым ліку і вялікія моўныя генератыўныя мадэлі (якія часцей за ўсё і называюць штучным інтэлектам) мяняюць сферу інтэлектуальнай працы. Лічбавыя рашэнні ўжо абышлі чалавека ў выкананні многіх руцінных функцый: пачынаючы з фарміравання бухгалтарскіх дакументаў і заканчваючы пабудовай маршруту руху ў навігатарах. Камп'ютар даўно хутчэй за нас лічыць, запамінае больш аб'ём інфармацыі, хутчэй яе знаходзіць і кампануе... Нейрасеткі ўжо нядрэнна малююць, пішуць вясёленькія вершы, складаюць з нот іншы раз прыстойную музыку, нават пішуць праграмныя коды не горш, чым сярэднестатыстычны праграміст.

Факт: лічбавыя рашэнні ўжо ў значнай ступені ўзялі на сябе руцінную працу. Добрая нагода задумацца аб канкурэнцыі з машынай. І яна магчымая. Перш за ўсё ў тых галінах, у якіх нейрасеткі і лічба нам прайграюць у чыстую — творчыя кірункі ў самым шырокім разуменні гэтага слова. Нейрасеткі працуюць з вялізнымі масівамі даных, але, па сутнасці, могуць толькі кампіляваць пройдзены матэрыял. Адлюстраваць нешта прынцыпова новае ў іх атрымліваецца слаба. Камп'ютар разумны, але празмерна рацыянальны і лагічны, таму не можа зазіраць за гарызонт: ён не ўмее марыць. Для электроннага мозгу ёсць мінулае, якое захоўваецца ў тэрабайтах інфармацыі, але адсутнічае будучыня. Электроніка пазбаўлена фантазіі.

Вобразнае мысленне — канкурэнтная перавага чалавечага розуму над паўправадніковым.

Іншае пытанне, што лічба вядзе атаку з гэтага боку на чалавека. Аўдыёвізуальны кантэнт захоплівае інфармацыйную прастору. Некаторыя алармісты не выключаюць, што гадоў гэтак праз 30—50 ніхто ўжо не будзе чытаць і пісаць. У гэтым адпадзе неабходнасць: пяройдзем на зносіны праз малюнкі і відэашэрагі. Тады і абрынецца наш апошні бастыён перад машынным інтэлектам. Ён і цяпер ужо падвяргаецца бамбардзіроўцы, бо мозг неабходна трэніраваць. Кніга прымушае працаваць наша шэрае рэчыва, з апісанняў аўтара складаць у галаве ўнікальныя вобразы герояў апавядання, сцэны, развіццё падзей. Візуал ярчэй, больш зразумелы, больш эмацыйны ў нейкай ступені, але для мозгу з'яўляецца спрошчанай задачай. Думаць не трэба — глядзі і запамінай. Праўда, запамінаем мы менш і горш за машыну. Таму загадзя прайграем. Заліпанне ў гаджэтах небяспечна з пункту гледжання атрафіі вобразнасці мыслення. І ёсць ужо наступствы. Далёка не ўсе зумеры, заплюшчыўшы вочы, могуць уявіць уласную руку! Такая рэальнасць. Магчыма, кніга не самы сучасны носьбіт інфармацыі. Але яна забяспечвае нашу канкурэнтаздольнасць у свеце электроннага мыслення. Нагода задумацца для многіх: і для дзяцей-падлеткаў, і для бацькоў, якія іншы раз пагардліва ставяцца да несучасных спосабаў навучання. Але без іх наш мозг дрэйфуе ў бок спрашчэння і пагражае ператварыцца ў звычайны камп'ютар. Толькі маламагутны ў параўнанні з нейрасеткамі.

**Аляксей КЛІМАЎ.**

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», ул. Немига, 40, пом. 46, офис 2, г. Минск, 220004. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Могилевоблресурсы». 212040, г. Могилев, ул. Залуцкого, 23. УНП 700010221 |
| **Оператор ЭТП/ Адрес ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», ул. Немига, 40, пом. 46, офис 1, г. Минск, 220004. **www.ipmtorgi.by** |
| **Предмет повторных электронных торгов** | |
| **Здание магазина 336,0 кв. м** (730/С-11262), **склад 61 кв. м** (730/С-11881), **гараж, сторожка 136 кв. м** (730/С-11882), **гараж, склад 80 кв. м** (730/С-11883), **котельная 48,1 кв. м** (730/С-11884). Адрес: **Могилевская обл., Кричевский р-н, г. Кричев, ул. Крупской, д. 6.** ***Сведения о земельном участке:*** пл. 0,9308 га, предоставлен на постоянного пользования для размещения объектов розничной торговли | |
| ***Обременение:*** котельная является неэффективно используемой. На здание котельной изготовлена ведомость тех. характеристик. Регистрация права собственности покупателем будет происходить в соответствии с Указом Президента РБ от 19.09.2022 № 330 «О распоряжении имуществом» | |
| **Начальная цена лота с НДС 20 % – 145 344,00 бел. руб.** (снижена на 20 %) Шаг торгов – 5 % от начальной цены лота | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона | |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов:** в течение **10 (десяти)** календарных дней после подписания договора купли-продажи | |
| Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by). Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, размещенное на странице лота во вкладке «Документы». Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену | |
| Победитель электронных торгов либо единственный участник, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение 4 % от цены продажи лотов в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов | |
| Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 11.09.2025 | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 06.01.2026.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов. **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 05.01.2026 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** | |
| **Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 29-154-34-35. E-mail: auction@cpo.by** | |

**ЗАО «БелБанкротАукцион»,**
организатор торгов по продаже имущества
**ОАО «УНР КЭУ»** (УНП 100363960),
объявляет о проведении **09.01.2026 г.** в 12.00
публичных торгов по адресу:
г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501.

**Перечень предметов торгов публично размещен на сайте: bankrot-torg.by.**

Адрес нахождения имущества: г. Минск, ул. Геологическая, 87.

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. 80293316941.

Продавец: ОАО «УНР КЭУ», тел. 80296953010.

Организатор торгов: ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501; 80296083100; contact@bankrot-torg.by.

Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере 10 % от начальной стоимости лота не позднее **08.01.2026 г.** на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933, в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются с 9.00 **17.12.2025** по 17.00 **08.01.2026** по адресу: г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501.

Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах:

- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета публичных торгов;
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за 5 дней до даты проведения торгов.

Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.

Оформление результатов торгов в день проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах, при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Затраты на организацию и проведение торгов составили: стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счету-фактуре, аукционный сбор по лоту № 7 – 5 % от цены реализации предмета торгов без учета НДС (НДС 20 %), по лотам №№ 11, 12 – 2 % от цены реализации предмета торгов без учета НДС (НДС 20 %), по остальным лотам – 9 % от цены реализации предмета торгов без учета НДС (НДС 20 %).

Дополнительные условия: нет.

Срок подписания договора купли-продажи: в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Срок оплаты по договору купли-продажи: в течение 30 календарных дней с даты проведения торгов.

Ранее опубликованное извещение: газета «Звязда» от 29.11.2025 г.

ТРЫ ПЫТАННІ ДА ЎЛАДЫ

# УЯЗНЫЯ ВАРОТЫ Ў БЕЛАРУСЬ

## Што дазваляе Воранаўскаму раёну развівацца і прыгажэць



Так склалася, што на Воранаўшчыне няма прамысловых прадпрыемстваў. За выключэннем сельгастэхнікі, дзе наладжана вытворчасць прычэпаў, вядомых не толькі ў краіне, але і за яе межамі. Гэта цалкам аграрны раён, які славіцца высокімі ўраджаямі. Бягучы год выпрабоўваў на прафпрыдатнасць і стойкасць нават вопытных аграрыяў. Аднак гэта не перашкодзіла заняць чацвёртае месца ў вобласці па валавым зборы збожжа, стаць другімі па вырошчванні і валавым зборы цукровых буракоў. Як і належыць прыгранічнаму раёну, Воранаўшчына заўжды ў добрай форме. Дадаць прыгажосці населеным пунктам дазволілі мерапрыемствы, рэалізаваныя ў Год добраўпарадкавання. За кошт чаго прыгажэе і эканамічна мацнее раён, карэспандэнту «Звязды» расказаў старшыня Воранаўскага райвыканкама Васіль ШЛЫК.



***— Васіль Мікалаевіч, як Воранаўскі раён завяршыў сельскагаспадарчы год?***

— Нягледзячы на складаныя кліматычныя ўмовы, атрыманы нядрэнныя вынікі ў галіне раслінаводства. Валавы збор збожжавых і зернебабовых культур без кукурузы ў першапачатковай вазе склаў 110,4 тысячы тон, што на 8,5 % вышэй за ўзровень мінулага года. Ураджайнасць збожжавых культур павялічылася з 48,7 ц/га ў 2024-м да 53,2 ц/га сёлета. Дастойныя вынікі далі бураковыя палеткі: сабралі 260,5 тысячы тон, што на 20,5 % больш, чым летась. Атрымана 8,6 тысячы тон бульбы. З года ў год расце вытворчасць кармоў. Свой уклад у забеспячэнне харчовай бяспекі краіны ўносяць і работнікі жывёлагадоўчай галіны. Валавы надой малака склаў 83,6 тысячы тон і павялічыўся ў параўнанні з мінулым годам на 1,2 %. Мяса выраблена ў аб'ёме 11,1 тысячы тон, пры сярэднясутачным прыбаўленні вагі буйной рагатай жывёлы ў 752 грамы, свіней — 714 грамаў. Прымаюцца дзейсныя меры па вырашэнні асноўнай праблемы жывёлагадоўчай галіны — скарачэнні падзяжу буйной рагатай жывёлы. Сёлета за 10 месяцаў падзеж знізіўся на 166 галоў. Праводзіцца мэтанакіраваная работа па закупцы маладняку буйной рагатай жывёлы. У планах прадпрыемстваў раёна — перасягнуць узровень мінулага года па аб'ёмах вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі.

***— Які практычны эфект чакаецца ад рэалізацыі ініцыятыў, ажыццёўленых у кантэксце праграмы «Адзін раён — адзін праект»?***

— Па гэтай праграме ў раёне рэалізоўваюцца два інвестыцыйныя праекты. Па-першае, ажыццяўляецца рэканструкцыя будынкаў і збудаванняў, інжынернай і транспартнай інфраструктуры з узвядзеннем транспартна-лагістычнага цэнтра «Беняконі-Белмытсэрвіс» па аказанні паслуг па складзіраванні і дапаможнай транспартнай дзейнасці. Рэалізацыя інвестыцыйнага праекта дазволіць удасканаліць інфраструктуру прыгранічнай тэрыторыі раёна, развіць новыя віды аказання паслуг у сферы тэрмінальнай апрацоўкі тавараў і транспартнай лагістыкі, вырашыць праблему чэргаў грузавых аўтамабіляў шляхам іх арганізаванага размяшчэння на стаянках ТЛЦ, стварыць новыя працоўныя месцы (не менш за 20) з заработнай платай на ўзроўні сярэдняй па рэспубліцы. Па-другое, узводзіцца пляцоўка для размяшчэння лініі сартавання цвёрдых камунальных адходаў на 5 тысяч тон у год, што забяспечыць комплексную перапрацоўку адходаў, павысіць экалагічную бяспеку насельніцтва.

***— Якія праекты ажыццявілі ў Год добраўпарадкавання?***

— У мерапрыемствах па навядзенні парадку на зямлі былі задзейнічаны прадпрыемствы ўсіх форм уласнасці, жыхары раёна. У прыватнасці, праведзены санітарная высечка драўняна-хмызняковай расліннасці каля дарог, санітарная высечка і прыборка ў лясным фондзе. У сельскіх населеных пунктах заменены трухлявыя платы, ліквідаваны стыхійныя звалкі, спілаваны аварыйныя дрэвы, ажыццёўлены рамонт вулічна-дарожнай сеткі, знесены аварыйныя жылыя дамы. Палепшана якасць пітнога водазабеспячэння шэрагу паселішчаў. Наведзены парадак на месцах пахавання ўдзельнікаў і ахвяр Вялікай Айчыннай вайны, устаноўлены памятныя знакі ахвярам генацыду. Рэалізаваны дзве грамадзянскія ініцыятывы. На тэрыторыі аграгарадка Гіркі добраўпарадкаваны парк «Утульнае месца», дзе створаны камфортныя ўмовы для адпачынку. У аграгарадку Пагародна рэалізоўваецца грамадзянская ініцыятыва «Парк адраджаецца!», якая прадугледжвае захаванне, аднаўленне і добраўпарадкаванне гісторыка-культурнай каштоўнасці — парку канца XVIII стагоддзя. Наш раён з'яўляецца ўязнымі варотамі ў Беларусь, таму работа па добраўпарадкаванні населеных пунктаў працягнецца.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота дадзена Воранаўскім райвыканкамам.**





Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | ОАО «Минский домостроительный комбинат», 220015, г. Минск, ул. Пономаренко, 43 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 |
| **Адрес ЭТП** | www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов.**
**Адрес: г. Минск, ул. Академика Купревича**

| № лота | Наименование, инв. номер | Общ. пл., кв. м | Адрес | Начальная цена, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| **1** | **Квартира,** 500/D-7988236246 | 91,9 | 16-71 | 322 110,00 |
| **2** | **Квартира**, 500/D-7988243192 | 63,5 | 16-6 | 265 907,68 |
| **3** | **Квартира**, 500/D-7988243201 | 63,8 | 16-34 | 283 147,44 |
| | **Машино-место**, 500/D-7988227728 | 13,7 | 16/1-26 | |
| **4** | **Квартира,** 500/D-7988243352 | 57,5 | 16-151 | 282 537,56 |
| | **Машино-место**, 500/D-7988227729 | 13,6 | 16/1-27 | |
| **5** | **Квартира**, 500/D-7988243339 | 48,8 | 16-112 | 223 379,20 |
| | **Машино-место**, 500/D-7988227730 | 13,3 | 16/1-35 | |
| **6** | **Машино-место**, 500/D-7988243022 | 13,4 | 16/1-13 | 17 160,00 |
| **7** | **Машино-место**, 500/D-7988242974 | 13,2 | 16/1-62 | 16 920,00 |
| **8** | **Машино-место**, 500/D-7988242975 | 13,5 | 16/1-63 | 17 280,00 |
| **9** | **Машино-место**, 500/D-7988242976 | 13,2 | 16/1-66 | 16 920,00 |
| **10** | **Машино-место**, 500/D-7988242977 | 13,4 | 16/1-68 | 17 160,00 |
| **11** | **Машино-место**, 500/D-7988242978 | 13,8 | 16/1-69 | 17 640,00 |
| **12** | **Машино-место**, 500/D-7988242980 | 13,7 | 16/1-75 | 17 520,00 |
| **13** | **Машино-место**, 500/D-7988242981 | 13,8 | 16/1-79 | 17 640,00 |
| **14** | **Машино-место**, 500/D-7988242982 | 13,8 | 16/1-80 | 17 640,00 |
| **15** | **Машино-место**, 500/D-7988242983 | 13,7 | 16/1-83 | 17 520,00 |

**Задаток** 1 % от начальной цены лотов №№ 1–5, **5 %** от начальной цены лотов №№ 6–15 перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 3 (три) рабочих дня** со дня завершения электронных торгов

**Срок оплаты предмета электронных торгов: 6 (шесть) рабочих дней** с даты заключения договора купли-продажи

В случае несвоевременной оплаты предмета электронных торгов согласно договору купли-продажи Покупатель уплачивает пеню в размере 0,2 % от суммы неисполненных обязательств (невыплаченной суммы) по договору за каждый день просрочки платежа

В случае расторжения договора купли-продажи по инициативе Покупателя Покупатель уплачивает Продавцу неустойку (штраф) в размере 15 000 белорусских рублей

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и установленное вознаграждение **1 %** от цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 06.11.2025 г. (лоты №№ 1-5)

**Дата и время начала и окончания электронных торгов. 29.12.2025 г.** с 11.00 до 13.00 (лоты №№ 1–5), **16.01.2026 г.** с 11.00 до 13.00 (лоты №№ 6–15). Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки** на участие в электронных торгах принимаются на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by по **24.12.2025 г.** до 17.00 (лоты №№ 1–5), по **15.01.2026 г.** до 17.00 (лоты №№ 6–15)

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37, +375 (29) 317-95-42.**
**E-mail: auction@cpo.by**

Ініцыятыва ВІТАЕЦЦА!

# ГОРАД ПОМНІЦЬ ГЕРОЯЎ

## У Быхаве аднавілі легендарную плошчу ў гонар авіятараў 57-й дывізіі

У савецкія гады Быхаў быў месцам дыслакацыі 57-й Чырванасцяжнай Смаленскай марской ракетаноснай авіяцыйнай дывізіі і яго ведалі практычна ўсе авіятары вялікай краіны. Дваццаць гадоў таму гарнізон быў расфарміраваны, але ў горадзе па-ранейшаму пра яго шмат што нагадвае. У былой школе № 3, якая цяпер з'яўляецца гімназіяй, функцыянуе музей, прысвечаны слаўнай дывізіі. У горадзе шмат аб'ектаў, якія расказваюць пра мінулае ваеннага гарадка. І жыхары шануюць закладзеныя ў тыя гады традыцыі, выхоўваюць моладзь на прыкладах вайскоўцаў. У горадзе ёсць нават плошча ў гонар 33 Герояў Савецкага Саюза, якія маюць дачыненне да славутай вайсковай часці. Сёлета яна была абноўлена і добраўпарадкавана.

Ініцыятыва калектыўная, але яе правадніком стала патрыёт свайго горада **загадчыца Быхаўскага дзіцячага садка № 1 Маргарыта БАРКОВА.** Яна тут правяла дзяцінства і робіць усё для таго, каб папулярызаваць сваю радзіму.

Плошча сапраўды ўражвае. Па перыметры ўстаноўлены бюсты 30 Герояў Савецкага Саюза. Яшчэ пра трох можна пачытаць на ўстаноўленай тут стэле. Дзякуючы школьнаму ваенна-гістарычнаму музею гэтай дывізіі захавалася падрабязная інфармацыя пра яе мінулае, у тым ліку і пра стварэнне гэтай плошчы. Пра тое, што Герояў усё ж такі на тры больш, даведалася **заснавальніца і кіраўнік гэтага музея, выкладчыца грамадазнаўства Валянціна МАРЖЭРЫНА.** Маргарыта Баркова прызнаецца, што ўшчыльную працавала з дадзенай інфармацыяй па гэтай тэме.

Работа ж наогул зроблена каласальная. Праект перамог на конкурсе грамадскіх ініцыятыў і атрымаў праз Магілёўскую абласную асацыяцыю мясцовых Саветаў дэпутатаў больш чым 45 тысяч рублёў на рэалізацыю.

— Наогул, праект ацэньваўся ў 51 566 рублёў, з якіх 5 156 рублёў (10 %) па ўмовах конкурсу павінны былі сабраць жыхары, — расказвае Маргарыта Уладзіміраўна. — А сабралі аж 17 тысяч! Мы ездзілі, сустракаліся з людзьмі, праводзілі сходы, гутарылі з працоўнымі калектывамі. Быў адкрыты разліковы рахунак у беларускіх і расійскіх рублях. І грошы пайшлі, нават з Расіі. Падключыліся выпускнікі трэцяй школы, якая цяпер гімназія.




Арганізацыя, што выйграла тэндар па аднаўленні плошчы, прывяла ў парадак тумбы. А вось бюсты на іх рэанімавала магілёўская мастачка Кацярына Зубарэвіч. Плошча была створана ў 1969 годзе, бюсты першапачатковы «асвяжалі», накладваючы чарговы слой фарбы. У выніку твары Герояў ужо цяжка было разгледзець. Пры рэстаўрацыі мастачцы прыйшлося звяраць іх па фатаграфіях.

— Акрамя гэтага, былі зроблены таблічкі, устаноўлены флагштокі, тэрыторыя цалкам заасфальтавана, разбіты клумбы, пасаджаны туі, — расказвае актывістка. — Старшыня райвыканкама Аляксандр Кісялёў асабіста пасадзейнічаў, каб была цалкам добраўпарадкавана плошча. Шмат сіл уклаў у гэты праект старшыня райсавета Вячаслаў Сідарэнка, які каардынаваў усю работу. Калі працавалі, людзі падыходзілі і казалі, што таксама здавалі грошы на гэту плошчу. Яны спачатку не верылі, што можна ўсё аднавіць, і вельмі радаваліся, калі ў нас атрымалася.

Адкрыццё абноўленай плошчы адбылося 7 лістапада. На ўрачыстым мерапрыемстве прысутнічалі старшыня райвыканкама і райсавета, сенатар, старшыня Магілёўскага аблсавета Аляксандр Гарошкін, ганаровыя грамадзяне горада, прадстаўнікі Беларускага саюза афіцэраў, а таксама арганізацый і аб'яднанняў горада. Сабралася шмат быхаўчан, прыйшла моладзь.

— Аднаўляючы плошчу, мы яшчэ раз прадэманстравалі падтрымку палітыкі Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі, накіраваную на захаванне нашай гісторыі, — заўважае Маргарыта Баркова. — Хацелася захаваць гэта сімвалічнае месца для нашчадкаў, каб яны ганарыліся. Плошча вельмі папулярная ў моладзі. Прыемна бачыць, як уважліва яны вывучаюць інфармацыйныя стэнды.

Асобная тэма — школьны музей, які сёння працуе не толькі з быхаўскай моладдзю, а нават на міжнародным узроўні. Музей уваходзіць у Асацыяцыю ваенна-марскіх музеяў і захавальнікаў марскіх традыцый і Асацыяцыю гістарычных і ваенна-гістарычных музеяў Расійскай Федэрацыі.

— Гэта дае нам магчымасць працаваць з дакументамі расійскіх музеяў і архіваў бясплатна, — удакладняе Валянціна Маржэрына. — А сёння толькі адна копія з фатаграфіі мінулага стагоддзя каштуе некалькі тысяч расійскіх рублёў. Мы таксама ўваходзім у міжнародны праект «Сябруем у прамым эфіры» і штотыдзень адпраўляем у Маскву навіны. 13 лістапада ўся Расія глядзела нашу інфармацыю пра адкрыццё абноўленай плошчы Герояў Савецкага Саюза ў Быхаве.

У музейнай рабоце вельмі актыўны ўдзел бяруць навучэнцы гімназіі. **Вучаніца 11 класа Ева ЧАРНЯЎСКАЯ,** напрыклад, — экскурсавод і адначасова камандзір ваенна-патрыятычнага клуба «Міратворцы».

—Тыя веды, якія я атрымліваю ў музеі, часта прымяняю на гістарычных квізах, — адзначае Ева. — А падчас напісання праекта ад ваенна-патрыятычнага клуба я падтрымала наш музей. Праект называўся «Ёсць ідэя. Стварэнне вуліцы Герояў». Прапаноўваю, каб у пачатку кожнай вуліцы, якая названа ў гонар Героя Савецкага Саюза, быў зроблены мемарыяльны знак з інфармацыяй пра гэтага чалавека. Тады моладзь будзе ведаць славутых стваральнікаў нашай гісторыі, якой мы ганарымся.

Дарэчы, работа Евы Чарняўскай заняла трэцяе месца ў вобласці.

— Патрыятычнае выхаванне — гэта важна, — лічыць Ева. — Народ, які не ведае гісторыі сваёй дзяржавы, не можа казаць пра свой суверэнітэт. Тое, што адрознівае незалежную дзяржаву ад проста краіны, — у першую чаргу ўсвядомленасць яе народа. Вядома, усё можна паглядзець у інтэрнэце, даведацца пра нешта новае, але зусім іншая справа, калі ты бачыш жывую гісторыю перад вачыма і жывеш ёй.

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
**фота аўтара.**
*г. Быхаў*



# ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

по продаже права на размещение средства рекламы, в том числе средства наружной рекламы, на государственном недвижимом имуществе (земельные участки, относящиеся к землям общего пользования) в г. Гродно
**20 января 2026 года**

| № п/п | Адрес места и срок размещения средства наружной рекламы | Тип технического средства | Количество конструкций (единиц) | Количество сторон (плоскостей) | Начальная цена, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | ул. Гаспадарчая, на территории, прилегающей к зданию № 8/1, сроком на 3 года | рекламная двусторонняя щитовая конструкция (6 м х 3 м) | 1 | 2 | 566,78 | 566,78 |
| 2 | ул. Белые Росы, на территории, прилегающей к зданию № 16, сроком на 3 года | рекламная двусторонняя щитовая конструкция (6 м х 3 м) | 1 | 2 | 566,78 | 566,78 |
| 3 | Скидельское шоссе, территория, прилегающая к зданию № 10, сроком на 3 года | рекламный двусторонний световой пилон (5,5 м х 3,4 м) | 1 | 2 | 692,72 | 692,72 |
| 4 | ул. Пучкова, территория, прилегающая к зданию № 35, сроком на 3 года | рекламный двусторонний световой пилон (2,7 м х 1,1 м) | 1 | 2 | 157,18 | 157,18 |
| 5 | Скидельское шоссе, территория, прилегающая к зданию № 2, сроком на 3 года | рекламный двусторонний световой пилон (4,35 м х 2,8 м) | 1 | 2 | 644,56 | 644,56 |

Аукцион состоится **20 января 2026 года** в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, актовый зал.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, телефоны: 8 (152) 626055, 626056; 8 (029) 5444025.

Задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению не позднее **14 января 2026 года** (в случае участия в торгах в отношении нескольких лотов задаток вносится для каждого из предметов аукциона) на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 Гродненское областное управление № 400 ОАО АСБ «Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, УНП 590727594, код назначения платежа 40901, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона обязан перечислить на расчетный счет, указанный в протоколе о результатах торгов, сумму средств, за которую продан предмет торгов, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору торгов затраты на их организацию и проведение. Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 117, в рабочие дни с 8.00–13.00 и 14.00–17.00 **с 22 декабря 2025 г. по 14 января 2026 г.**

Заявление на участие в аукционе подается с приложением следующих документов: заверенная банком копия платежного документа о внесении суммы задатка на расчетный счет организатора торгов; копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя; эскиз средства наружной рекламы, выполненный в цвете на бумажном носителе в формате А4 или электронном носителе. Физическим лицом, в том числе индивидуальным предпринимателем предоставляется документ, удостоверяющий личность; представителем физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица – оригинал документа, подтверждающего его полномочия, и документ, удостоверяющий личность.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке проведения торгов на право размещения средств рекламы на недвижимом имуществе, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 7 июля 2021 г. № 395. До начала аукциона его участники проходят регистрацию (в т. ч. доводится информация о затратах на организацию и проведение аукциона). Аукцион проводит аукционист, определяемый организатором торгов. Аукцион начинается с оглашения аукционистом правил проведения аукциона, начальной цены, шага аукциона. Шаг аукциона: от 5 до 15 процентов от предыдущей цены предмета аукциона. Не допускается продажа предмета аукциона по начальной цене. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимет только один участник. Аукционист трижды называет цену, по которой продан предмет аукциона, и объявляет о продаже данного предмета аукциона, а также сообщает номер участника, выигравшего аукцион по данному предмету аукциона, который является победителем аукциона. Аукцион по конкретному предмету аукциона признается несостоявшимся, о чем комиссией составляется протокол о признании аукциона несостоявшимся, если заявление на участие в нем подано только одним участником, или для участия в аукционе не было подано ни одного заявления, или на аукцион явился один из участников, или ни один из участников не явился на аукцион.

Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Для получения разрешения на размещение средства наружной рекламы рекламораспространитель (победитель аукциона) представляет в Гродненский городской исполнительный комитет заявление и иные документы, предусмотренные в регламенте административной процедуры по выдаче разрешения на размещение средства наружной рекламы, не позднее 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах торгов.

Гродненский городской исполнительный комитет и рекламораспространитель (победитель аукциона) в течение 10 рабочих дней со дня регистрации заявления заключают договор на размещение средства наружной рекламы, в соответствии с которым победителю аукциона предоставляется право на использование городской среды в рекламных целях.

Рекламораспространитель (победитель аукциона):

- самостоятельно получает технические условия и изготавливает проект на электроснабжение средства наружной рекламы с учетом требований СП 4.04.01-2022 (если это требуется). При производстве строительно-монтажных работ руководствуется Правилами по охране труда при выполнении строительных работ (постановление № 24/33 от 31.05.2019 г. Министерства труда и социальной защиты Республики Беларусь и Министерства архитектуры и строительства Республики Беларусь).

- размещает средство наружной рекламы в течение двух месяцев со дня выдачи разрешения на размещение средства наружной рекламы.

- несет ответственность за несущую способность, монтаж и эксплуатацию средства наружной рекламы и разрабатывает техническую документацию на конструкцию. Монтаж средства наружной рекламы осуществляет из элементов заводского изготовления в соответствии с действующими строительными и нормативно-техническими требованиями.

- обязан содержать средство наружной рекламы в надлежащем техническом и эстетическом состоянии.

- после окончания размещения средства наружной рекламы обязан демонтировать рекламную конструкцию (наземную часть и фундамент), восстановить газонное и/или тротуарное покрытие.

ПСІХАЛАГІЧНЫ ПРАКТЫКУМ

# ВЫНІКІ ГОДА

## Як аналізаваць свой досвед?

Час ляціць неўзаметку. Здаецца, толькі ўчора мы сустракалі 2025 год, будавалі планы і ставілі мэты. Падвядзенне вынікаў — не фармальнасць, а інструмент унутранай работы. І для яе поспеху важна ўлічваць шэраг аспектаў.

### АД ТЭОРЫІ ДА ПРАКТЫКІ

Як спраўляцца з расчараваннем і незадаволенасцю? Часта выніковы аналіз паказвае, што шмат якія пункты засталіся нявыкананымі, і мы адчуваем расчараванне. Важна ўмець пераўтвараць расчараванне ў матывацыю.

### АБ'ЕКТЫЎНАЯ РЭФЛЕКСІЯ: ШТО АТРЫМАЛАСЯ, А ШТО — НЕ

Знайдзіце спакойны час і месца, вазьміце нататнік. Згадайце ключавыя падзеі мінулага года: прафесійныя дасягненні, асабістыя перамогі, важныя знаёмствы, станоўчыя перамены ў здароўі ці звычках. Важна не проста пералічваць падзеі, а шукаць заканамернасці, выяўляць свае моцныя бакі і зоны росту. Напрыклад, калі вы заўважылі, што часта адкладалі важныя справы, задумайцеся аб прычынах: страху няпоспеху ці непрадукцыйнай арганізацыі часу.

### ВОСЬ НЕКАЛЬКІ СТРАТЭГІЙ:

• Даруйце сабе свае памылкі. Няма ідэальных людзей і ідэальнага жыцця. Вучыцеся прымаць няўдачы як досвед.
• Замест зацыклівання на негатыве шукайце пазітыўныя моманты і магчымасці.
• Святкуйце маленькія перамогі. Гэта ўмацуе ўнутраную ўпэўненасць.
• Падзяляйце задачы на дробныя крокі да вялікіх мэт.
• Знаходзьце час для аналізу вынікаў як мінімум раз у год, лепш часцей.
• Будзьце сумленныя і шчырыя з сабой.



### ПРАКТЫКАВАННІ ДЛЯ РАБОТЫ З ПАЧУЦЦЯМІ І ДУМКАМІ:

**«Кола жыцця:** баланс сфер». Намалюйце круг, падзяліце яго на сегменты для розных сфер жыцця (здароўе, кар'ера, сям'я, асобасны рост, адпачынак і хобі, фінансы). Ацэніце сваю задаволенасць па кожным сегменце па шкале ад 1 да 10.

Прааналізуйце, у якіх сферах баланс парушаны і куды варта ўкласці больш увагі. Прыклад: калі ў вас ацэнка ў здароўі «4», а ў кар'еры — «8», магчыма, трэба надаць больш часу фізічнаму стану.

**Тэхніка «Ліст з будучыні».** Напішыце сабе ліст з будучыні (каб прачытаць праз год). У ім апішыце, чаго вы дасягнулі, якія вынікі і ўрокі атрымалі, якімі пачуццямі напоўнены. Мэта — стварыць візуалізацыю жаданай будучыні і ўмацаваць матывацыю для дасягнення задач.

**Тэхніка «Мае пачуцці сёння».** У канцы кожнага дня фіксуйце ў дзённіку і апісвайце свае асноўныя эмоцыі. Выкарыстоўвайце шкалу ад 1 да 10, каб ацаніць іх інтэнсіўнасць. Гэта дапаможа зразумець, якія сітуацыі выклікаюць у вас пазітыўныя ці негатыўныя пачуцці, і выпрацаваць стратэгіі кіравання імі. Калі вы сутыкаецеся з негатыўнымі думкамі ці сумневамі, паспрабуйце задаць сабе пытанне: «А што, калі я пагляджу на гэта з іншага боку?»

На аснове вынікаў мінулага года сфармулюйце новыя мэты. Яны павінны быць канкрэтнымі, рэалістычнымі і значнымі для вас. Пры гэтым важна памятаць, што поспех залежыць і ад таго, наколькі вы сумленныя з сабой і гатовы прыняць свае слабасці і памылкі.

Час, пражыты за год, — найкаштоўнейшы рэсурс. Аналізуючы яго, мы не толькі вынясем урокі, але і пачынаем лепш разумець свае жыццё, жаданні і магчымасці. Няхай наступны год стане для вас годам асобаснага росту, радасці і гармоніі.

### ЭМАЦЫЯНАЛЬНЫ АНАЛІЗ: ЯК АДЧУВАЎ(ЛА) СЯБЕ НА ПРАЦЯГУ ГОДА

Эмоцыі — найважнейшы індыкатар унутранага стану. Успомніце моманты, калі вы былі шчаслівыя, ганарыліся сабой, адчувалі падзяку ці, наадварот, трывогу, расчараванне, апатыю.

Запішыце 3—5 найбольш яркіх эмацыйных момантаў гэтага года.

Ацаніце іх інтэнсіўнасць па шкале ад 1 да 10.

Паспрабуйце зразумець, што іх выклікала, якія думкі ці сітуацыі. Разуменне сваіх эмацыйных патэрнаў дапамагае кіраваць імі і ствараць пазітыўны ўнутраны стан.

### ВЫСНОВЫ І ЎРОКІ: ШТО Я ДАВЕДАЎ(ЛА)СЯ ПРА СЯБЕ

Гэты этап — самы важны: менавіта на яго аснове адбываецца развіццё. Пытанні для разважання:

• Якія звычкі садзейнічалі поспеху?
• Якія памылкі паўтараліся і што я з іх вынес(ла)?
• Што я зразумеў(ла) пра свае каштоўнасці і прыярытэты?
• Якія якасці мне трэба ўдасканальваць?

Гэта магчымасць вызначыць свае моцныя бакі і тыя, якія неабходна развіваць. Напрыклад, калі вы заўважылі, што ў складаных сітуацыях схільныя да панікі, варта папрацаваць над стрэсаўстойлівасцю. Калі разумееце, што адчуваеце страх перад новымі пачынаннямі, не перашкодзіць прапрацаваць упэўненасць у сабе.

Псіхолаг Алена ШАЎЧЭНКА.



## Извещение о повторном открытом аукционе по продаже имущества ОАО «Радиоволна» в г. Гродно

**20 января 2026 года**

| Продавец | **Открытое акционерное общество «Радиоволна», г. Гродно, ул. Максима Горького, 89, тел. 8 (0152) 62-66-48** |
|---|---|
| Лот № 1 | Имущество, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 440100000002011816 по ул. Максима Горького, 89/25 площадью 0,0939 га (имущественное право земельного участка – право аренды): **Капитальное строение с инвентарным номером 400/С-165014** (назначение: здание административно-хозяйственное, наименование: вспомогательно-бытовой корпус) площадью 1105,70 кв. м.<br>Капитальное строение расположено в зоне производственной застройки «П-1». В производственных зонах возможно размещение промышленных предприятий, транспортной и инженерной инфраструктуры, коммунальных, коммунально-складских и складских объектов, обеспечивающих функционирование этих предприятий. В состав зон данного типа включаются санитарно-защитные зоны промышленных предприятий и обслуживающих их объектов. Обременений нет.<br>Начальная цена продажи: **503 040,00** белорусских рублей (с учетом НДС 20 %).<br>Сумма задатка: 25 152,00 белорусских рублей |
| Организатор аукциона: **Коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1, тел.: 8 (152) 626055, 626056** | |
| Дата проведения аукциона: **20 января 2026 года.** Время проведения аукциона: **12.00** | |
| Место проведения аукциона: **г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1, актовый зал** | |
| Место приема заявлений и прилагаемых к нему документов: **г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1, кабинет № 117** | |
| Дата и время начала приема документов: **19 декабря 2025 года 08.00;** дата и время окончания приема документов: **14 января 2026 года 17.00** | |

При проведении торгов предусмотрен шаг аукциона 5 %.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

- копии платежных поручений об оплате задатка на расчетный счет BY24AKBB30120000418104000000 Гродненское областное управление № 400 ОАО АСБ «Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, УНП 590727594, код назначения платежа 40901, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости»; **гражданином**: копия документа, содержащего его идентификационные сведения; **индивидуальным предпринимателем**: копия свидетельства о государственной регистрации ИП; **представителем гражданина или индивидуального предпринимателя**: нотариально удостоверенная доверенность; **представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица РБ:** доверенность, выданная юр. лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юр. лица, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица. Граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юр. лиц, уполномоченные должностные лица юр. лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность. Уполномоченное лицо (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные гражданами, ИП, юр. лицами, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия должностного лица.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Торги в отношении предмета аукциона проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.

Срок заключения договора купли-продажи – в течение 15 рабочих дней с момента проведения торгов.

Оплата производится в течение 30 календарных дней с момента заключения договора.

Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Извещение опубликовано на сайтах: Государственного комитета по имуществу **au.nca.by,** Гродненского городского исполнительного комитета **grodno.gov.by,** коммунального унитарного предприятия по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» **gcn.by**

# СВЯТА ЖЫВАТА

## Фарміруем пад Новы год здаровыя традыцыі і звычкі



Пра штто трэба памятаць, сядаючы ў самую чароўную ноч за стол, каб не выклікаць раніцай хуткую дапамогу, расказала кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт кафедры тэрапіі Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў аховы здароўя БДМУ Жанна СУХІХ.



### АДМОВІЦЦА АД ТЛУСТАГА, СМАЖАНАГА, ВЭНДЖАНАГА

Пасля свят у гастрааддзяленні клінік традыцыйна паступае шмат пацыентаў з абвастрэннямі хранічных паталогій страўнікава-кішачнага тракту (часцей за ўсё хвароб жоўцевага пузыра і падстраўнікавай залозы), а таксама з праблемамі, якія заявілі пра сябе ўпершыню.

— Як правіла, прычына гэтага — злоўжыванне смажаным, тлустым, вострым, вэнджаным, а таксама алкаголем, — адзначае Жанна Леанідаўна. — Відавочна, калі хочацца пазбегнуць непрыемнасцяў, падобныя стравы і напоі трэба мінімізаваць. Сучасны лад жыцця падахвочвае да таго, каб перагледзець некаторыя харчовыя звычкі і сфарміраваць новыя традыцыі.

### НЕ ГАЛАДАЦЬ

Яшчэ важная парада — не галадаць 31 снежня, чакаючы апоўначы. Трэба і снедаць, і абедаць. Паколькі святочная вячэра ў апошні дзень адыходзячага года вельмі позняя, лепш зрабіць акцэнт на лёгкіх, карысных стравах. Навагодні стол павінен быць незвычайным, прыгожым, смачным, дарыць задавальненне.



Пачынаць лепш з салатаў са свежай агародніны, а таксама дыетычных страў: запечаных кабачкоў, баклажанаў, перцаў, гарбузоў. Таксама варта ўпрыгожыць стравы зелянінай: кропам, базілікам, пятрушкай, кінзой — гэта дадасць святочнаму сталу прывабнасці і карыснасці.

### ІНДЫЧКА І РЫБА

У навагоднім меню абавязкова павінны быць бялковыя стравы. З мяса лепш аддаць перавагу індычцы і курыцы, прыгатаваным у духоўцы. Паколькі Новы год выпадае на час каляднага паста, для тых, хто яго прытрымліваецца, не стане праблемай наогул адмовіцца ў гэту ноч ад мяса і малочных прадуктаў, а абмежавацца рыбай. Можна прыгатаваць стравы з выкарыстаннем арэхаў, бабовых культур.

### САЛАТ — СІМВАЛ СВЯТА: КРЫШАЧКУ ВЫПРАЎЛЯЕМ РЭЦЭПТ

Тым, хто не ўяўляе навагодні стол без легендарнага аліўе, Жана Сухіх рэкамендуе замяніць маянэз у яго складзе ёгуртам з невялікай колькасцю гарчыцы, каўбасу — курацінай і зусім не ўключаць бульбу. Традыцыя будзе выканана, задавальненне — не меншае, але калярыйнасць ніжэй, ды і карысці нашмат больш.



### НА ДЭСЕРТ — САДАВІНА І ЯГАДЫ

Найлепшы варыянт навагодняга дэсерту — гэта садавіна і ягады. Вельмі карысная беларуская «антонаўка» дзякуючы высокаму ўтрыманню вітамінаў (перш за ўсё вітаміну C), мінералаў, клятчаткі. Тыя, хто аддае перавагу больш салодкім дэсертам, могуць яблыкі запячы, дадаць мёд, арэхі — у такім выглядзе ад іх у захапленні будуць і дарослыя, і дзеці. Аранжавая садавіна — апельсіны, мандарыны, хурма — не толькі смачныя і карысныя, але нават сваёй прысутнасцю на стале паднімаюць настрой.

Садавіна і ягады, мусы і жэле з іх выкарыстаннем — гэта лёгкія нізкакаларыйныя дэсерты, якія даставяць задавальненне і не створаць адчуванне цяжару ў страўніку.

### ЕЖЫ — МЕНШ, ВАДЫ — БОЛЬШ

Невялікія порцыі — гарантыя таго, што вы пазбегнеце пераядання ў навагоднюю ноч. Папярэдзіць яго, падтрымаць баланс у арганізме дапаможа і вада, якую не трэба забываць піць. А вось з алкагольных напояў дастаткова аднаго фужэра шампанскага або белага віна да рыбы ці чырвонага да мяса.

### РАДАВАЦЬ ВОКА І РУХАЦЦА

Святочны настрой ствараецца прыгожым афармленнем стала і страў. Новы год — якраз той час, калі кожны здольны стварыць «маленькі цуд». Калі хтосьці лічыцца з усходнімі гараскопамі, можна любімы салат выкласці ў форме каня (2026 год па кітайскім календары — год Чырвонага Вогненнага Каня).

І памятайце: нават ад самага прыгожага і смачнага стала варта час ад часу адрывацца, каб выйсці на вуліцу, падыхаць свежым паветрам і пагуляць.

**Вольга ПАКЛОНСКАЯ.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

по продаже земельного участка в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, земельного участка в частную собственность с расположенным на нем не завершенным строительством незаконсервированным жилым домом

**Организатор электронных торгов:** Туринский сельский исполнительный комитет, Минская обл., Пуховичский р-н, аг. Турин, ул. Центральная, 49Б, тел.: (801713) 98635, 43296, 8 (029) 7503249.
**Оператор электронной торговой площадки:** открытое акционерное общество «Белорусская универсальная товарная биржа»
**Электронный адрес электронной торговой площадки:** www.et.butb.by. Дата проведения электронных торгов: **2 февраля 2026 г.**
**Время проведения электронных торгов** устанавливается ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество»

| № лота | Адрес объекта, характеристики | Кадастровый номер; целевое назначение земельного участка; вид права | Площадь земельного участка, *га* | Инженерная инфраструктура (возможность подключения) | Начальная цена, *руб.* | Задаток, *руб.* | Расходы по подготовке, *руб.* |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Минская область, Пуховичский р-н, дер. Уголец, ул. Ясная, уч. 71 | 624487909601000186, строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома; частная собственность | 0,086 | Сети электроснабжения | 4889,41 бел. руб. (не завершенного строительством жилого дома – 2 223,41 бел. руб., земельного участка – 2 666,00 бел. руб.) | 488,94 | Затраты на организацию и проведение электронных торгов 3078,23 + расходы на публикацию в СМИ, расходы на оплату услуг оператора эл. торговой площадки |
| 2. | Минская область, Пуховичский р-н, аг. Турин, ул. Центральная, уч. 29А | 624487909101000302, строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома; частная собственность | 0,2017 | Сети электроснабжения, газоснабжения, водоснабжения | 13 800,00 | 1 380,00 | Затраты на организацию и проведение электронных торгов 3 475,92 + расходы на публикацию в СМИ, расходы на оплату услуг оператора эл. торговой площадки |
| 3. | Минская область, Пуховичский р-н, д. Шкавиловка, уч. 24 Г | 624487910101000098, строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома; частная собственность | 0,2128 | Сети электроснабжения, газоснабжения | 5 450,00 | 545,00 | Затраты на организацию и проведение электронных торгов 2972,61 + расходы на публикацию в СМИ, расходы на оплату услуг оператора эл. торговой площадки |

**Задаток** для участия в электронных торгах перечисляется на текущий (расчетный) счет № BY60AKBB30120000066940000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код AKBBBY2X, УНП 190542056, получатель платежа – ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа».

**Срок внесения задатка** – до подачи заявления на участие в электронных торгах. **Назначение платежа:** внесение суммы задатка на участие в торгах.

**Окончание приема заявлений на участие в электронных торгах** с прилагаемыми к ним документами – **28 января 2026 года до 15.00.**

Лицо, желающее принять участие в электронных торгах в отношении нескольких предметов электронных торгов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из этих предметов. Оплата стоимости предмета торгов осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.

Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время либо с участием представителя организатора в рабочее время (понедельник–пятница, 8.30–13.00, 14.00–17.30).

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением о порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608 и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» от 29.12.2015 № 143.

СПОРТ-ТАЙМ

# БЕЛАРУСКІ ХАКЕЙ ГАТОВЫ ВЯРНУЦЦА ВА ЎСЕ МІЖНАРОДНЫЯ ТУРНІРЫ

## Чакаем рашэння ад міжнароднай федэрацыі

### Больш за дзясятак залатых узнагарод узялі беларускія гімнасты на турніры ў Ташкенце

Беларускія гімнасты заваявалі больш за дваццаць узнагарод традыцыйнага міжнароднага турніру па спартыўнай гімнастыцы ва Узбекістане, паведамілі ў прэс-службе Беларускай асацыяцыі гімнастыкі.

У актыве нашай каманды 12 залатых, 11 сярэбраных і 4 бронзавыя медалі. Перамогі ў мнагабор'і атрымалі Хрысціна Галкоўская (юніёркі), Алена Жыхарава (дзяўчаты 2012 г. н.), Эмілія Фясенка (2013 г. н.), Арсеній Баклага (юніёры) і Уладзіслаў Герасімаў (юнакі). Акрамя таго, беларускі занялі першы радок у камандным першынстве.

### Віктар Ганчарэнка стане новым галоўным трэнерам зборнай Беларусі

Вядомы беларускі спецыяліст Віктар Ганчарэнка ўзначаліць зборную Беларусі.



Нагадаем, апошнім месцам працы беларускага спецыяліста быў «Пары Ніжні Ноўгарад». Ганчарэнка трэніраваў ніжагародскую каманду з кастрычніка 2024 года па чэрвень 2025 года. Пад яго кіраўніцтвам «Пары НН» удзельнічаў у 22 матчах ва ўсіх турнірах, у якіх шэсць разоў перамог, чатыры разы згуляў унічыю і 12 разоў пацярпеў паражэнне.

На працягу кар'еры Ганчарэнка працаваў у беларускім БАТЭ, а таксама ўзначальваў расійскія клубы «Кубань», «Урал», «Уфа», маскоўскі ЦСКА, «Краснадар».

Адзначаецца, што кантракт паміж 48-гадовым спецыялістам і АБФФ будзе дзейнічаць да снежня 2027 года.

У трэнерскі штаб Ганчарэнкі ўвойдзе Аляксандр Ермаковіч, які дзеля работы ў нацыянальнай камандзе адмовіўся ад пасады галоўнага трэнера ў брэсцкім «Дынама».

20 снежня Віктар Ганчарэнка вернецца з водпуску і неўзабаве пасля гэтага падпіша дагавор з федэрацыяй.

Апошнія два гады трэнерам зборнай Беларусі быў Карлас Алос. Беларуская федэрацыя футбола скасавала кантракт з іспанскім спецыялістам і яго трэнерскім штабам пасля няўдалага выступлення на адборы да чэмпіянату свету — 2026, дзе наша каманда здолела набраць два ачкі за шэсць гульняў, згуляўшы ўнічыю з Даніяй (2:2) і Грэцыяй (0:0).

### Аляксандр Багдановіч: ёсць пазітыўныя навіны



Зборная Беларусі па хакеі заняла другое месца на Кубку Першага канала, які прайшоў у Новасібірску. Падапечныя Дзмітрыя Квартальнага абыгралі зборную Казахстана (4:1) і ўступілі камандзе «Расія 25».

— Кубак Першага канала — турнір з вялікай гісторыяй, — сказаў пасля яго завяршэння **кіраўнік беларускай федэрацыі хакея Аляксандр БАГДАНОВІЧ.** — Склад удзельнікаў у ім мяняўся, але ўзровень барацьбы, канкурэнцыі заўсёды заставаўся нязменна высокі. Для нашай зборнай гэта добрая магчымасць праверыць свае сілы на міжнароднай арэне — у складзе каманды Расіі ёсць уладальнікі Кубка Гагарына, нават прызёр Алімпійскіх гульняў, Казахстан — пастаянны ўдзельнік чэмпіянатаў свету, так што ўсе прыязджаюць матываванымі.

Тым часам з'явілася і прыемная навіна для беларускіх аматараў хакея: Міжнародны алімпійскі камітэт дазволіў міжнародным федэрацыям праводзіць спаборніцтвы на тэрыторыі Беларусі, а таксама зняў з маладых беларускіх спартсменаў абмежаванні на ўдзел у міжнародных стартах.

— Гэта, бясспрэчна, пазітыўныя навіны, якія дазваляюць нам разлічваць на найхутчэйшае вяртанне нашых маладшых зборных у сістэму чэмпіянатаў міру, — сказаў Аляксандр Багдановіч. — Цяпер справа за IIHF — ці гатовы яны ўбраць палітыку ў бок і вярнуцца да прынцыпаў Алімпійскага руху. Як прафесійны спартсмен магу сказаць, што выходзіць на пляцоўку з гербам на грудзях, чуць гукі свайго гімна — гэта ні з чым не супастаўныя пачуцці, гэта магчымасць аддаць належнае Радзіме, якая шмат робіць для кожнага спартсмена ў нашай краіне. І пазбаўляць атлетаў такога права — бесчалавечна. З іншага боку, мы бачылі, што нават у нейтральным статусе ўсе выдатна ведалі і назіралі, як змагаліся нашы атлеты, якія заваявалі медалі на мінулых Алімпійскіх гульнях, немагчыма заплюшчыць вочы мільёнам заўзятараў па ўсім свеце. Разам з тым мы павінны разумець, што век прафесійнага атлета не занадта доўгі, таму пазбаўляць іх мары аб выступленні на чэмпіянатах свету або Алімпійскіх гульнях з-за колеру формы не трэба, такі шанц можа выпасці ўсяго аднойчы, а за кожным з такіх спартсменаў варта штодзённая праца дзясяткаў, а часам і сотняў людзей, нельга абясцэньваць гэта.

**Анатоль СЛАНЕЎСКІ.**

НАДВОР'Е

# ДОЖДЖ, ТУМАН І ГАЛАЛЁДЗІЦА

## Днём да 7 °С з плюсам



Вось такая цяпер у нас зіма. Папесціла нас злёгку снегам — і хопіць. А надалей чакаецца ўсё больш плюсавая тэмпература, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Сёння без істотных ападкаў, толькі ноччу і раніцай месцамі па паўночным усходзе краіны пройдуць невялікія ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. У многіх раёнах будзе згушчацца туман. Ноччу і раніцай месцамі па краіне чакаецца слабы галалёд. Вецер заходні, паўднёва-заходні — ад слабога да ўмеранага. Тэмпература паветра ўначы — ад мінус 3 да плюс 3 °С, днём — ад 1 да 6 °С цяпла.

У сераду будзе пераважна без ападкаў. Месцамі па краіне будуць утварацца туман і слабы галалёд. Вецер паўднёвай чвэрці ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 да плюс 2 °С, днём — ад 1 °С марозу па паўночным усходзе да 7 °С цяпла па паўднёвым захадзе краіны.

У чацвер чакаецца пераважна без ападкаў, толькі ў асобных раёнах па поўначы нашай краіны пройдуць невялікія кароткачасовыя дажджы. Месцамі чакаецца слабы туман і галалёд. Вецер заходняй чвэрці ад слабога да ўмеранага. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 да плюс 2 °С, днём — ад мінус 1 да плюс 5 °С.

**Сяргей КУРКАЧ.**






Фота Лізаветы ГОЛАД.


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. УНП 191224638. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ОАО «Гомельский винодельческий завод», 246003, г. Гомель, ул. Рогачевская, 10. УНП 400051877 |

**Предмет электронных торгов – б/у станки, оборудование, резервуары, цистерны, пищевое и иное имущество в кол-ве 52 единиц по адресу: г. Гомель, ул. Рогачевская, 10 (полный перечень имущества размещен на ЭТП ИПМ-Торги www.ipmtorgi.by и в газете «Звязда» от 29.11.2025 г.)**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 3 (три) рабочих дня** со дня завершения электронных торгов

**Срок оплаты предмета электронных торгов: 3 (три) рабочих дня** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **6-10 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 29.12.2025 г. с 11.00 до 13.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **24.12.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |


**Калектыў Выдавецкага дома «Звязда» смуткуе з нагоды смерці Уладзіміра Паўлавіча Хількевіча. Уладзімір Паўлавіч шмат гадоў працаваў у газеце «Звязда», усе яго памятаюць як інтэлігентнага, адукаванага прафесіянала, да якога заўсёды можна было звярнуцца па параду і дапамогу. Выказваем шчырыя словы спачування яго дачцэ, нашай калезе, Вераніцы Паўлаўне, усім родным і блізкім.**


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 11 129. Індэкс 63850. Зак. № 2695.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 15 снежня 2025 года.